Юбілей з махам ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Па слядах мінулага ☞ 8-9

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 11 (2757) Год LIV | Беласток, 15 сакавіка 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

„А ты старік куды” ў другі раз?

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

— Імпрэза як імпрэза, — кажа Міхал, дзеяч культуры з вопытам, — мяне цяжка схапіць знянацку, бо амаль усё бачыў, але знаеш, што мяне калісь захапіла? „Юр’я”. Гэта была энергія.

Хаця фольк-мадэрну, які прэзентавала „Юр’я” не было ў беластоцкім клубе Фама, то быў проста беларускі мадэрн у розных відах. На тое і наладжана мерапрыемства, якое ўжо пусціла карані. Самае важнае каб паказваць, што насуперак усім додумкам у Беларусі існуе сучасная культура і ёсць людзі, якія займаюцца сучасным мастацтвам.

— Калі мы год таму думалі з сябрамі з БАСу пра назоў і кшталт нашага фільмавага падарожжа па Беларусі, шукалі нейкай свабоднай назвы, без нагрузкі пафасу — тлумачыць Мацек Рант з Беластоцкага асяродка культуры, — знайшлі такую назву, якая, думаю, трапляе да маладых і выклікае прыхільную ўсмешку.

„А ты, старік, куды?” — пытаецца нейкі герой з паштоўкі, якая ўжо другі раз запрашала галоўным чынам жыхароў Беластока на сустрэчу з беларускай культурай. Хто дазнаўся з паштоўкі, хто з афішы, а хто з інтэрнэту — мала важна, асабліва калі глядзіцца на такі натоўп, да гэтага яшчэ без узроставых межаў. У вочы аднак кідалася перад усім група маладых людзей, звычайна добра зінтэграваных.

— Паверыш, — кажа мне сябра, — яны зарганізавалі сабе самі транспарт і прыехалі спецыяльна на канцэрт!

Гэта праўда, каб пабачыць канцэрт гурту IQ48 моладзь з бельскага беларускага ліцэя вырашыла самастойна наладзіць паездку ў пятніцу ў Беласток. Узбуйніла колькасць гледачоў, але і ўнесла шмат маладой энергіі, нават надзеі на актыўнасць новага пакалення. Яшчэ цікавей было прыглядацца беларусам з Меншчыны, Гарадзеншчыны, а можа і з іншых рэгіёнаў Беларусі, якія таксама пацікавіліся бадай першым, па-за Басовішчам, канцэртам IQ48 у Беластоку, як і эксклюзівам у якасці паказу беларускіх кліпаў.

— Мы прыдумалі Кліп-Марафон, бо ў Беларусі такіх фэстываляў не было, — кажа Міхал Нядзьвецкі, дырэктар прэміі беларускага музычнага відэа „Кліп-Марафон”. Ёсць аналагічныя фестывалі ў Расіі, Партугаліі, MTV таксама прызнае свае ўзнагароды, чаму тады немагчыма ў нас гэтага стварыць.

У снежні 2008 прайшоў ужо другі выпуск фестывалю. Трэба падкрэсліць аднак, што ўдзел у ім могуць прымаць

Міхал Нядзьвецкі, дырэктар прэміі беларускага музычнага відэа „Кліп-Марафон”

відэа да песень запісаных на беларускай мове. Гэта абмяжоўвае ў значнай ступені доступ вельмі добрых кліпаў да спабору і паказаў, але тут здаецца моўны прынцып становіцца важнейшым за якасць прадукцыі. І ўсё здавалася б у парадку, калі б не факт, што якасць і ўзровень фестывальных кліпаў паказвае на вялікія недахопы ў беларускай вытворчасці.

— Яны павінны паказаць гэтыя рарытэты і хапіла б, — сказаў адзін з гледачоў.

— Калі пачаўся другі кліп з рыцарамі, то я пайшоў у туалет, — дадаў другі.

Было і шмат прыхільных галасоў у бок паказу кліпаў на фамаўскім мерапрыемстве, бо не кожны меў шанц раней пабачыць першы беларускі кліп на песню „Ура” гурту Бонда з 1988 года ці сапраўдны скарб сярод беларускіх кліпаў, зняты ў першай палове 1990-тых гадоў яшчэ Беларускім тэлебачаннем, на песню „Гомельскі вальс” „Крамы”. На жаль, чарга фільмаў ды іх агульны выгляд — тэмы, здымкі, паказалі, колькі працы чакае яшчэ беларускіх (і не толькі, бо частку кліпаў здымала ў Варшаве тэлебачанне БелСат) фільмоўцаў або колькі грошай трэба яшчэ сабраць, каб паспрабаваць зрабіць нешта цікавае і прыцягальнае. Дасканалым прыкладам можа быць кліп на адну з песень Таццяны Беланогай. Цудоўную анімацыю з пластыліну перабівала штораз вакалістка на фоне начнога зорнага неба. Зразу мне асацыюецца стан чалавечы, які падказвае: як найбольш, цябе, твайго, тваім, табою. Добрую ідэю лёгка папсаваць. Няхай тут прыкладам з другога боку будзе кліп на песню „Тры янгалы” Тройцы, дзе анімацый не ў змозе заступіць ніводная карцінка бубнача ці спяваючага вакаліста, бо ўсё перадумана з пачатку да канца і так мусіла быць. Гэта такі адзін з сапраўды нешматлікіх прыкладаў, з ліку якіх варта таксама ўспомніць „Капітал” „Ляпіс Трубецкага”. Дзякуй менскаму фестывалю з’явілася таксама DVD з гэтымі кліпамі, але ці можа быць яно візіткай беларускага кліпу? Цяжка адказаць. Можа лепш чакаць больш спрыяльных часоў ды ўмоў.

На ўмовы не мае што наракаць затое Яўген Ацецкі, фатограф, які прэзентаваў на „старіку” свае здымкі. Хаця не паслухаў рады арганізатараў і прымусіў павесіць здымкі ў фармаце, які сам зрабіў (значыцца, меншым чым пажадана), і так варта было спыніцца на момант пры яго фатаграфіях.

Думаю, Яўген добра трапіў, бо на „старіку” ёсць месца перад усім для цікавых, амбітных маладых мастакоў. Неразлучным элементам такіх фільмавых ды мастацкіх мерапрыемстваў з’яўляецца музыка. Дыджэй Алян Кубэрт з Гомеля, які завяршаў сваім музычным наборам усё мерапрыемства, меў сапраўды цяжкую задачу. Супакойваў публіку пасля экстатычнага канцэрта „здаровых ласей” з IQ48.

— Гэта найлепшы наш клубны канцэрт! — ледзь дыхаючы кажуць пасля канцэрта музыкі. — Не спадзяваліся!

— Месца мяне зразу пазітыўна ўразіла, — кажа Саша, вакаліст, — але не думаў, што так цёпла прыйме нас публіка. Мы тут жа ўпершыню.

— Крычалі, спявалі з намі, дзеўкі нават блузкі задзіралі! — з шырокай усмешкай распавядае Buzza, гітарыст.

Апісаць гэтую радасць і эмоцыі сапраўды цяжка. Я сама не спадзявалася такога вялікага сэрца з боку публікі для менчукоў. Яны вядомыя з-за неакрэсленага стылю і неверагоднай энергіі. Усё гэта можна было пабачыць у клубе Фама, бо канцэрт у музычным плане быў сапраўды каляровы, але і цяжкі заадно.

— Не іграе з намі ўжо саксафаніст, — кажуць хлопцы, але цяжка было гэтага не заўважыць, бо IQ48 асацыяваўся перад усім з саксафонам. — Мы баяліся, як гэта ўспрымуць слухачы, але абдорылі нас вялікім даверам, пашанай і проста любоўю.

Што ж тут дадаць? Хіба, што спыняць такога марафону беларускай культуры нельга.

Запрашэнне

25.03.1918 БНР 25.03.2009

Святкаванні 91-х угодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі

адбудуцца ў Беластоку ў кафэ „ФАМА”, па вуліцы Легіяновай, 25.03.2009 а 18 гадзіне. Уступ свабодны

Запрашаюць: Телеканал Белсат, Радыё Рацыя, „Ніва”, Беларускі саюз

у праграме м.інш.

Прэзентацыя дакументальнага фільма телеканала Белсат пра Слуцкі збройны чын, канцэрт барда Зміцера Бартосіка з Мінска

Сустрэча з цыкла Размовы аб... людзях

„Гайнаўскі Нікіфар” ЗЭНЭК

(Іларыён Данілюк)

— Сустрэча з гайнавянінам Янам Грыкам

і прамоцыя ягонага альбома „Зэнэк”

— Дэманстрацыя фільма „Зэнэк”

— Выстава фатаграфій

13 сакавіка 2009 г. (пятніца) гадз. 17:00

Цэнтр прамоцыі рэгіёна „Чарлёнка” вул. Тамары Саланевіч, 2 Гайнаўка

ЗАПРАШАЕМ!

Серада з Віктарам Шведам

Ваяводская бібліятэка ў Беластоку „Падляшская Ксёнжніца” імя Лукаша Гурніцкага запрашае на сустрэчу з цыкла „Літаратурныя серады” з **Віктарам Шведам** у зале пазычальні кніг (вул. Кілінскага 11) 18 сакавіка, пачатак у 17 гадзіне.

ЗАПРАШАЕ

ПАГАВОРЫМ ПРА... (ДЫСКУСІЙНЫ КЛУБ АБ-БЫ)

Месца сустрэч: Пачатковая школа нумар 4 Беласток вул. Чэнстахоўска, 6а, а гадз. 18.00

13 САКАВІКА 2009 г.:

Пагаворым пра тоеснасць

— сустрэча з **Кастусём Бандаруком**, святаром, паэтам, журналістам, мастаком.

Праект рэалізаваны дзякуючы фінансавай падтрымцы Маршалкоўскай управы Падляшскага ваяводства

9 770546 196000

Супольнасць і рыцары плашча

Больш дванаццаці гадоў таму пашчасціла трапіць мне ў сталіцу Чэхіі Прагу на адкрыццё помніка Францішку Скарыну. Здарылася так, што беларусы ў гэты гістарычны для нашай культуры дзень былі прадстаўлены дзвюма плынямі — афіцыйнай урадавай дэлегацыяй і нефармальнай нацыянальнай грамадой, якая складалася з прыехаўшых з Беларусі і прадстаўнікоў новай хвалі эміграцыі. Зразумела, што вакол шнырыла і дастатковая колькасць тых, у прамыя службовыя абавязкі каго ўваходзіць „сачэнне за працэсам". Усё ішло сваім парадкам, пакуль хтосьці з маладых не прынёс колькі бел-чырвона-белых сцягоў. Дзяржаўных чыноўнікаў РБ ахапіў сапраўдны спалох. Але яшчэ страшней стала прадстаўнікам маладой эміграцыі. Выявілася, што узяць сцягі няма каму. У аднаго рукі апынуліся занятыя фотаапаратам, у іншага — дыктафонам. Ну а трэці наўпрост заявіў: „Ну, што вы — я ж у плашчы, з якім сцяг не стасуецца!". Давялося пад касавурыя позіркі чыноўнікаў і аб'ектывы камер уздымаць сцягі нам, прыехаўшым з Беларусі.

Прыгадалася мне гэтая, ужо досыць даўняя гісторыя, на Шостым з'ездзе Асамблеі няўрадавых арганізацый ды ініцыятыў, пад час выступаў некаторых дэлегатаў. Гэтыя выступоўцы, калі спрасціць слоўную эквілібрыстыку, намагаліся давесці лінію чысціні грамадскага сектара Беларусі ад палітызацыі. Канкрэтней — няма чаго ўлучаць у Рабочую групу асамблеі прадстаўнікоў Беларускага Народнага Фронту „Адраджэнне". Маўляў, у палітыкаў — свой шлях, а ў грамадскіх актывістаў — свой. І разам ім не па дарозе. Лішне казаць, што галасы гэтыя гучалі пераважна на чужой расейскай мове. Балазе, знайшлося каму належна адказаць на некарэктныя эскапады. Найбольш пераканаўча выступіў Вінцук Вячорка, які слушна давёў, што БНФ „Адраджэнне" — гэта не толькі партыя, але і грамадскі рух, які паўстаў задоўга да партыі, намнога шырэй яе, быў у свой час магутнай, а сёння, нягледзячы на ўсе расколы і падзелы, застаецца ўплывовай сілай.

У звычайнай, кожнай еўрапейскай дзяржаве, дзе існуе рэальны падзел галін улады, палітыка, эканоміка, трэці сектар, хоць і цесна пераплецены, існуюць і развіваюцца паасобку. У Беларусі рэальная сітуацыя зусім іншая. У чыстым выглядзе ў нас не можа існаваць аніводная з'ява. На пытанне адначаснага сяброўства ў некалькіх грамадскіх арганізацыях і паралельна ў шэрагах палітычнай партыі ёсць два дыяметральна процілеглыя погляды. Адны катэгарычна не ўспрымаюць такога „сумяшчэння", іншыя (да іх ліку прыналежыць і аўтар гэтых нататак) перакананыя, што інакш і немагчыма. Таму, што кожная слушная грамадская ці палітычная ініцыятыва вымагае ад актыўных людзей салідарнасці і хоць маленькага, нават намінальнага, але ўдзелу.

Насамрэч праблема сённяшніх недзяржаўных арганізацый Беларусі ў тым, што апошнія дзесяць год яны развіваліся пераважна ўглыб. Кшталтаваліся каманды, прафесійныя здольнасці сябраў арганізацый, але рост ушыркі аб'ектыўна быў немагчымым. Дзяржава паслядоўна і бязлітасна адсякала грамадскіх актывістаў і іх ініцыятывы ад насельніцтва, таму што цудоўна ў асобах ідэолагаў рэжыму разумела небяспеку для сябе ў разбудове грамадзянскай супольнасці. З іншага боку, значная частка ранейшых рамантыкаў-ідэалістаў даўно пераўтварыліся ў „дзяцей капітала гранта", гэткіх жрацоў імпрэзы і семінару, якія сталі адкрыта дэкларавацъ сваю апалітычнасць і патрабаваць ад іншых „чысціні плашча". Іншыя адразу прышлі ў грамадскую дзейнасць дзеля сваіх карыслівых мэтаў. Бяззубае існаванне ў трэцім сектары ў варунках нарастання дыктатуры становіцца для іх лагічным спосабам не проста выжывання, але і досыць бяспечнага і забяспечанага жыцця. Прычым, пры патрэбе можна імітаваць бурлівую дзейнасць, але сутнасць ад гэтага не мяняецца.

Напэўна трэцяму сектару Беларусі патрэбныя дасведчаныя менеджэры, выкшталтаваныя трэнеры, спецыялісты па фанд-рэйзінгу, піяр-кампаніі і таму падобнае. Але ўсё гэта нішто, калі няма шчырасці, ахвярнасці, шанавання свайго, любові да беларускага. Бо генеральная місія недзяржаўных грамадскіх арганізацый — гэта гуртаванне супольнасці найперш для нацыянальнага адраджэння.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Адкуль той Карповіч?

Кажуць, каб здабыць узнагароду за найлепшую кнігу выдадзеную за апошні год у Беластоку, трэба яе выдаць па-за Беластокам, найлепш у вядомым, вялікім, прэстыжным выдавецтве. А падстава, згодная са статутам, такая: аўтар павінен быць у чымсьці звязаны з Беластокам: нарадзіцца тут, жыць, працаваць (таксама і ў мінулым). Год 2008 належаў да траіх аўтараў (з 22), намінаваных да ўзнагароды прэзідэнта Беластока імя Веслава Казанэцкага: Марты Гусьнёўскай (родам з Познані, працуе ў Беластоку ў Лялечным тэатры), Кацярыны Ляжэнскай (жыла ў Беластоку ў час вучобы ў VI ліцэі; яе радня з Беластока і ваколіц), і Ігната Карповіча (нарадзіўся ён у Беластоку ў бальніцы, але сам ён родам са Случанкі на Гарадоччыне). Карповіч жыў і ў Варшаве, і ў Беластоку, і ў Коста-Рыцы, і ў Эфіопіі, а цяпер цягне яго Кракаў. Карповіч быў леташнім лаўрэатам узнагароды імя Казанэцкага, за сваю трэцюю кнігу. Ні адна Ігнатава кніга не была выдадзеная ў Беластоку. Доўгі час увогуле не выдаваліся кнігі, а напісаў іх быў чатыры, аж „пстрыкнула" першая, „Niehalo", якраз пра Беласток, у выдавецтве „Czarne", якое ставіць якраз на „чорных коней". І пайшло-паехала: пашпарт „Палітыкі", які набілітуе перш за ўсё маладых творцаў яшчэ „без прозвішча". Апошняя кніга, „Жэсты", напісана інакш, чым ранейшыя, спакайней, без выдрымусаў (хоць некаторыя крытыкі адзначылі, што нуднейшая). Як сказаў адзін з членаў капітула, у гэтай кнізе аўтар паказаў Падляшша як месца добрае для таго, каб знайсці тут унутраны спакой. Герой „Жэстаў" старэйшы ад Ігната на гадоў дзесятак, і трыццацігодак, вядомы з радаснага карыстання іроніяй, гратэскам і камізмам зрабіў вівісекцыю на спелым мужчыне. Напісана нармальна, скажам, як пісалася з паўстагоддзя назад — прызнаўся, аўтар. Летась успамінаў, што напіша гэту кнігу за год. Як бачым, і выдаў яе (мы ж ведаем, што яна была ўжо напісана ў той час, калі яшчэ ніхто не хацеў друкаваць „нейкага Карповіча з падляшскай вёскі"). Хлопец у каляровых кедах і гарбузовага колеру блузе ды вылазячай з-пад споду ружовай кашулі (так апрануўся на прыняцце шаноўнай узнагароды ад эліты нашай метраполіі) аналізуе адчужанасць і атрутныя сувязі паміж людзьмі. Вядома, прыкрасіўшы ўсё гэта горкім гумарам, гульнёй на чытальніцкіх звычках. Героем выбраў дзядзьку без прыкмет (сярэдні тэатральны рэжысёр, з нецікавым асабістым жыццём), якога сэнсам жыцця з'яўляецца нараканне і распамятванне параз. Бацькі ягоныя, вядома, з Беластока. Баіцца жыцця і адзіноты. Мабыць, як усе мужчыны. Калі маці захварэе, эгацэнтрычны Грышка едзе ў радзінны дом, каб правесці з паміраючай маткай яе апошнія хвіліны. Да таго мацеры здох сабака. Ды замест таго, чаго можна спадзявацца (сямейнага паяднання), вяртаецца пекла дзяцінства, замест вечароў з успамінамі — тэлевізар, зацятае маўчанне ўперамежку з узаемнымі папрокамі. Цікава? Усё гэта ў сарака раздзелах (кароткіх), пазначаных усе на „г" — Галіны, Ганак, Газеты, Грабы... На вокладцы пазначана для цікаўнага чытача: *mocna rzecz!* Кнігу варта прачытаць хоць бы таму, што па мастацтве пісання імя Карповіча пералічваюць сярод найцікавейшых пісьменнікаў не толькі маладога пакалення, але ўвогуле польскіх літаратараў. І чакаюцца ягоныя кнігі перш за ўсё тут, на Беласточчыне, асабліва на Гарадоччыне (пад Случанкай кажуць: „наш Карповіч").

Ці планаваў Ігнат Карповіч зноў „захапіць" узнагароду? Не, таму і зайшоў па яе проста з вуліцы; ягоны „люзьны" строй на ўрачыстасці быў зусім не правакацыяй, хоць ён гэта любіць. Ці адчувае сябе „культурным амбасадарам" нашага стороння? Не, хоць цешыцца, што Беласток не асацыюецца адно з „прэзідэнтам" Канановічам. Жыве цяпер у Кракаве, але мяркуе, што паселіцца недзе на Падляшшы (Беласток для яго завялікі). Наездзіўшыся па свеце, абрыдлі яму пажарожы. Мае ўражанне, што нарадзіўся... ужо пенсіянерам (нам таксама здавалася, што Сакрат Яновіч заўсёды быў стары!). Разумны дзядзька з растрэпанай ветрам чупрынай. Цешышся, калі сустракаешся з такім, і калі чытаеш ягоныя думкі.

Беластачане інфармацыі пра ўзнагароджанне Ігната Карповіча каментавалі: „А адкуль ён? Зноў нашы грошы — 22 тысячы! — паедуць у свет? І ці не зачаста яго ўзнагароджваюць?" — пісалі ў інтэрнэце. Ну дык пішыце, пішыце!

Міра ЛУКША

Вачыма еўрапейца

Расізм і ксенафобія

Неяк так атрымалася, што ў апошні час амаль паралельна сеймавая камісія нацыянальных і этнічных меншасцей дэбатавала аб шавінісцкім і расісцкім змесце ў публічных медыях, а дзярждэпартамент ЗША (тое ж самае што ў еўрапейскіх дзяржавах міністэрства замежных спраў) апублікаваў штогадовы рапарт аб захоўванні правоў чалавека ў свеце, між іншым і ў Польшчы. Аўтары рапарту амерыканскага дэпартамента, хоць сцвярджаюць, што ў нашай краіне „генеральна захоўваюцца правы чалавека", дык пералічваюць выпадкі злоўжывання з боку паліцыянтаў (агулам больш за шэсць тысяч!), папракаюць у факце перапоўненых турмаў, карупцыі ці неэфектыўнасці правасуддзя. Урэшце пералічваюць у пунктах выпадкі антысемітызму, расізму (галоўным чынам у адносінах да ромаў, неграў, азіятаў і арабаў; прытым дыскрымінацыі падвяргаліся і беларусы ды ўкраінцы) і недахопе талерантнасці ў адносінах да гомасексуалістаў.

Прэс-сакратар МЗС у Варшаве Пётр Пашкоўскі м.інш. так пракаментаваў інфармацыі дыпламатаў ЗША:

— Большасць з праблем, якія кранаюцца ў рапарце, без змен сігналізуецца ад шмат гадоў у чарговых выданнях справаздачы. Таксама ёсць гэта пытанні са сферы публічнай дэбаты ў Польшчы, якія абшырна абмяркоўваюцца і апісваюцца польскімі медыямі.

Мяне асабліва зацікавіла пытанне ўсё выступаючых у Польшчы выпадкаў паводзін з шавінісцкім і расісцкім характарам. І мала мяне задавальняе адказ пана прэс-сакратара Пашкоўскага аб тым, што гэтыя з'явы сігналізуюцца ад шмат гадоў. Ну і што з гэтага? Што з сістэмай супрацьдзеяння гэтым з'явам? Урэшце, адкуль яны бяруцца, і да таго ўсё ў асяроддзях маладых (так прынамсі я прыкмячаю)?

У час пасяджэння сеймавай камісіі меншасцей упаўнамочаная ўрада па справах роўнага трактавання Альжбета Радзішэўская сцвердзіла, што ў час нейкіх доследаў аказалася, што ў Польшчы ад 2000 г. да 2005 г. „зафіксаваны быў рост ліку злачынстваў з расісцкім характарам":

— Не ёсць гэта рост вялікі, бо ён парадку толькі 2,5%. Аднак, сузіраючы маштаб з'явы, гэта рост сур'ёзны, і павінен нас трывожыць.

— На жаль, агромнай праблемай — не толькі ў Польшчы, але таксама і ў Еўропе — ёсць факт, што надалей маем шырокі доступ да ўсялякіх антысеміцкіх, ксенафобных і расісцкіх ідэй, таксама і да матэрыялаў, усхваляючых фашызм. [...] Мабыць, не выкарыстоўваем юрыдычных інструментаў, якія можам прымяніць.

Сумненні пані прэс-сакратар здзіўляюць. Гэта ж якраз яна аб паспяховасці гэтых юрыдычных інструментаў у гэтым кантэксце павінна ведаць найлепш, а калі даходзіць да такіх з'яў, а нават да іх росту, гэта значыць проста, што гэтыя інструменты „ненастроеныя". Прытым гэтак ёсць незалежна ад спецыяльных урадавых праграм і дзеянняў шматлікіх урадавых і няўрадавых арганізацый, займаючыхся праблематыкай расізму і ксенафобіі, таксама і пры МУСіА.

Найгоршым, на маю думку, з'яўляецца гэта, што шмат палітыкаў, якія — хоць бы па прычыне палітычнай карэктнасці — стараюцца быць праціўнікамі расісцкіх і ксенафобных паводзін, у гарачцы самых розных дэбат быццам бы падказваюць такія паводзіны. Нават адно з выказванняў на сеймавым форуме аднаго дэпутата мела пераклад на (быццам бы) анекдот, які кружыў ува ўвесяляльных праграмах адной тэлестанцыі, а якое паявілася пасля выбару афраамерыканца Барака Абамы на прэзідэнта ЗША: „У Абамы польскія сувязі. Яго дзед з'еў польскага місіянера". Так вось, панства палітыкі, зважайце на тое што гаворыце, бо ніколі невядома, якім інструментам стануць вашы словы, нават калі б вашы намеры былі выбрукаваныя добрымі памкненнямі.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

ЮБІЛЕЙ З МАХАМ

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Юбілейны, бо дзесяты выпуск Конкурсу беларускай гавэнды, што 27 лютага адбыўся ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, праходзіў з махам характэрным для большага мерапрыемства. На спаборніцтвы запрошаны былі прадстаўнікі ўстаноў, звязаных з друкаваным беларускім словам і журналісты электронных масмедыяў, прадстаўнікі стараства і магістрата, якія выступілі спонсорамі мерапрыемства (дафінансоўвае яго таксама школьны Бацькаўскі камітэт). Дырэктар Культурнага цэнтра Беларусі Аляксандр Карачун прыехаў з беларускім тэлевізарам „Гарызонт" у якасці ўзнагароды.

Спачатку адбылося падвядзенне вынікаў папярэдніх дзевяці конкурсаў, на якіх дзеткі і моладзь выступалі з расказамі на літаратурнай і гутарковай беларускай мове, а пазней адбыліся конкурсныя змаганні, у якіх прынялі ўдзел каля 35 асоб. Трэба сказаць, што сёлетні дзесяты выпуск адзначаўся высокім узроўнем расказаў. Было на ім даволі многа аўтарскіх аповедаў, якія былі плёнам супрацоўніцтва вучняў і настаўнікаў або іншых дарослых асоб. Былі і выпадкі, калі вучні самастойна падрыхтавалі вельмі ўдалыя аповеды.

Падтрымка беларускасці і роднага слова

Калі настаўнік белліцэя Ян Карчэўскі рашыўся зацікавіць вучняў і настаўнікаў новай конкурснай формулай — гавэндай, якая дагэтуль была малавядомай сярод дзетак і моладзі, не разлічваў на так масавае зацікаўленне маладога пакалення мерапрыемствам. Новы конкурс, у якім пераможцы, дзякуючы спонсарам, сталі атрымліваць каштоўныя ўзнагароды, стаў прыцягваць штораз то новых вучняў. Пазней мерапрыемства настолькі разраслося, што цяжка было даць магчымасць выступіць усім ахвотным. Дзеткі і моладзь сталі ў сваіх школах змагацца за права выступіць у актавай зале Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, які ўвесь час з'яўляецца арганізатарам конкурсу расказчыкаў. Аднак, на практыцы, гэта настаўнік беларускай мовы Ян Карчэўскі афармляе большасць спраў неабходных для правядзення спаборніцтваў, заўсёды выступае з уводным словам у час мерапрыемства і наглядае за яго ходам. Быў і надалей з'яўляецца душой конкурсных спаборніцтваў. А маюць яны рэальнае ўздзеянне на фармаванне беларускай нацыянальнай свядомасці маладога пакалення, якое ў агульным стала забываць мову сваіх бацькоў, дзядоў і прадзедаў. Сёлета, так як і ў мінулых гадах, у мерапрыемстве прымалі ўдзел дырэктар Гайнаўскага белліцэя Яўген Сачко, яго намеснік Ніна Лукасік, вучні і настаўнікі школы, якая гасцявала расказчыкаў.

— Конкурс арганізуем для ідэі падтрымлівання беларускасці і роднага слова, — заяўляе галоўны арганізатар гавэнды Ян Карчэўскі. — Вялікая колькасць ахвотных выступаць на нашым мерапрыемстве з'яўляецца якраз і доказам таму, што трэба яго ладзіць. Пазітыўныя водгукі аб конкурсе расказчыкаў даходзяць да мяне як ад вучняў, так і ад настаўнікаў. Я думаю, што ёсць сэнс арганізаваць маналагічны конкурс надалей, а прытым уводзіць нешта новае.

Белліцэістка Эвеліна Прабуцкая з Тыневіч (першае месца) хіба найбольш зацікавіла публіку сваім аповедам, цэлы час трымаючы добры кантакт са слухачамі

— Гавэнда падабаецца мне, бо ў час выступленняў можна тут свабодна выказваць свае пачуцці. Многа людзей можна тут спаткаць і атмасфера добрая. Я на гэтым конкурсе ўжо хіба пяты раз. Займала першае месца і атрымлівала ўзнагароды. У гэтым годзе я самастойна падрыхтавала расказ і дапамагала рыхтаваць расказ сяброўцы Ані, — расказвае Барбара Шусцік з Нараўчанскай школы. — Мне больш даспадобы сумныя расказы, бо ў час іх можна лепш выявіць свае эмоцыі.

— Гавэндаўскі конкурс гэта цудоўнае мерапрыемства, у час якога нашы вучні могуць выступаць на сцэне з тым, што любяць. Вучацца яны адвагі і маюць нагоду спаткацца з белліцэістамі, — кажа настаўніца з Чыжоў Вера Флёрчук.

Цікавым і вельмі эмацыянальным быў выступ гімназісткі Барбары Шусцік з Нараўчанскай школы з сумным расказам

Дзесяць гадоў назад некаторым вучням цяжка было зразумець розніцу паміж дэкламатарскім конкурсам і конкурсам расказчыкаў і таму здаралася, што яны чыталі фрагменты апавяданняў ці казкі. Пазней многа памянялася. Пачало паяўляцца штораз больш аўтарскіх расказаў саміх вучняў і дарослых асоб, якія сталі пад дзетак і моладзь рыхтаваць аповеды, звязаныя з рэальным вясковым жыццём ці незвычайнымі гарадскімі здарэннямі. Расказы аб жыцці ў мінулым давалі магчымасць зацікавіць маладое пакаленне гісторыяй. Адносна часта пераможцамі станавіліся вучні, якія рашаліся гаварыць па-свойму і расказваць пра здарэнні, якія краналі іх непасрэдна або маглі б крануць іх сямейнікаў ці сяброў. Мелі яны перавагу над тымі ўдзельнікамі, якія расказвалі на літаратурнай беларускай мове, бо, ведаючы дасканала мову роднай вёскі, маглі з ходу прыдумваць цікавыя здарэнні або імправізаваць, калі на тварах публікі бачылі зацікаўленне аповедам. Практычна не рабілі яны моўных памылак, якія здараліся вучням,

Сярод вучняў падставовых школ першае месца заняла Уршуля Беразавец з Нарваўскай школы, якая жартоўна расказвала па-свойму пра дыету

што расказвалі на беларускай літаратурнай мове. Аднак, такімі прывілеямі маглі пакарыстацца ў асноўным вясковыя вучні і прытым з тых сёл, дзе сярод маладога пакалення жыве яшчэ родная мова. Здараліся і выпадкі, калі гайнаўскія вучні, выступаючыя на гавэндаўскім конкурсе, свабодна размаўлялі са мной па-свойму, але былі гэта ўжо выключэнні. Шкада толькі, што конкурс расказчыкаў слабей прыняўся сярод гайнаўскіх белліцэістаў.

Высокі ўзровень конкурсу

У гэтым годзе гавэндаўскі конкурс распачаўся якраз з выступу белліцэісткі Эвеліны Прабуцкай з Тыневіч, у мінулым пераможцы прадметнага конкурсу па беларускай мове ў час яе вучобы ў Нарваўскай гімназіі. Яе былая настаўніца Ніна Абрамюк паінфармавала, што Эвеліна менавіта ў час вучобы ў гімназіі пераадолела сябе і стала часцей размаўляць па-свойму. Выступіла яна на характэрнай для Нарваўскай гміны мове і расказала пра паездку ў Амерыку. Патрапіла яна зацікавіць публіку сваім аповедам і ўдала наладзіць са слухачамі моўны кантакт. Сабраныя ў актавай зале вучні ўспрынялі яе расказ з вялікай дозай эмоцый. У некаторых дарослых ад смеху паявіліся слёзы. Аднак у аповедзе не было пераборшчвання і вопісаў непрыстойных паводзін, якія здараліся ў мінулым. Хаця Эвеліна выступіла ў сваёй катэгорыі ў адзіночку, слушным было прысваенне ёй першага месца.

З ліку вучняў падставовых школ, якія выступілі пасля белліцэісткі, пераможцамі сталі Анна Нестэрук з ПШ № 6 у Гайнаўцы і Уршуля Беразавец з Нарваўскай школы. Другія месцы занялі Павел Засім і Адам Харкевіч з Нараўчанскай школы; трэція — Агата Беразавец з Нарваўскай школы, Дамініка Пуц і Матэвуш Грыгаровіч з ПШ № 3 у Гайнаўцы, а таксама Дам'ян Сурэль з ПШ № 6 у Гайнаўцы.

Сярод гімназістаў першыя месцы занялі Рафал Кердылевіч з Дубіцкай школы і Наталля Андраюк з Чыжоўскай школы (паставілі яны на аповеды ўзятыя з рэальнага жыцця); другія месцы занялі Паўліна Башун і Наталля Семянюк з Чыжоўскай школы, Анна Кунцэвіч, Наталля Гаўрылюк і Якуб Сухадола, усе з Нараўчанскай школы; трэція — Дамініка Юшкевіч з Нарваўскай школы, Рафал Тамашук-Спірыдовіч з Дубінскай школы і Эвеліна Лясота з Нараўчанскай школы.

— Гавэндаўскі конкурс цікавы, бо ў час яго можна свабодна расказваць. Падабалася мне таксама ўзнагарода, якую я атрымаў за другое месца, — гаварыў Павел Засім з Семяноўкі.

— Я прывезла двух гімназістаў. Хлопец рашыўся гаварыць па-свойму, а дзяўчына на літаратурнай беларускай мове (першае месца заняў вучань, які на гаворцы вёскі Істок расказаў пра жыццё ў сваім сяле), — заявіла настаўніца з Дубіцкай школы Галіна Трашчотка. — Як я заўважыла, у нашых вучняў няма асаблівых хваляванняў перад выступамі і яны любяць паказацца перад публікай.

— Мы ад пачатку на гавэндаўскім конкурсе. У гэтым годзе прыехалі пераможцы з мінулых гадоў і дэбютанты. Нашы дзеткі і моладзь вельмі добра адчуваюць сябе тут і маюць нагоду выдатна пагуляць. Мы штогод робім у нашай школе адбор перад выездам у Гайнаўку. Расказы рыхтую супольна з вучнямі. Для часткі моладзі расказы рыхтуе былая бібліятэкарка Аліцыя Станько, — сказала настаўніца Ніна Абрамюк з Нарвы.

Супольна з вучнямі рыхтуе расказы таксама настаўніца Нараўчанскай школы Ліля Тарасевіч. Яе вучні вельмі ахвотныя выступаць на гавэндаўскім конкурсе і таму трэба было правесці адбор.

Для вучняў падставовых школ і гімназістаў быў наладжаны пачастунак і музычны канцэрт. Зала для выступаў была святочна ўпрыгожаная. Сабраныя атрымалі буклет з беларускім гербам „Пагоня", у якім змешчаны здымкі і інфармацыя пра папярэднія выпускі гавэнды. Сустрэча закончылася ў мілым настроі, паколькі многія ўдзельнікі змаганняў атрымалі цікавыя ўзнагароды.

Гайнаўка

Зімой не хочацца смажыць дранікаў

Гайнаўскі невялікі рэстаран, у якім летам часцавалі смачнымі дранікамі, знаходзіцца па вул. 3 Мая, недалёка ад скрыжавання з вул. Пілсудскага. Можна было тут заказаць дранікі са смятанай ці кефірам або з грыбным соўсам. У меню былі катлеты і праснакі. Падавалі тут каву, гарбату ды піва.

Вельмі шкада, што гэты міні-рэстаран не працуе зімою. Чаму?

Мне ў ім было прыемна і ўтульна. На бакавой сцяне прыцягваў зрок намаляваны мастаком прыгожы пейзаж. Можна тут было пачытаць прэсу, у тым ліку і наш беларускі тыднёвік „Ніву".

Вось каб у гэтай гастранамічнай дзялянцы паявілася канкурэнцыя! Смажыць дранікі — не такая складаная справа. А прыехаўшыя за пакупкамі ў горад ды турысты вельмі скарысталі б.

Гайнаўскія ўлады да гэтай праблемы ставяцца абыякава. А шкада.

На гайнаўскіх вуліцах

Не ўсё цешыць вока на гайнаўскіх вуліцах. Два гады таму на прыпынках аўтобусаў гарадскога транспарту па вуліцы 3 Мая пабудавалі лёгкія, прыгожыя паветкі-дашкі. Аднак пра іх не клапоцяцца. Цяпер яны брудныя, запэцканыя, а лавачкі „аблыселі" з фарбы.

Зараз у Гайнаўцы многа брыдкіх, пачварных дрэў з куксамі ад адсечаных галін. Найбольш іх па вуліцах: 3 Мая, Бельскай, Спартыўнай, Беластоцкай, Дзевятоўскага і Верабея. І гэта не заўсёды таму, што пад гэтымі дрэвамі знаходзяцца электрапровады вулічнага асвятлення. Так вось у ліпах-калеках (іх найбольш) няма ніякай красы. Але, па ўсім відаць, што яны падабаюцца гарадскому архітэктару краявіду.

Знікаюць як камфора з гайнаўскіх вуліц будкі з тэлефонамі-аўтаматамі. Таксама іх ліквідуюць. І зараз ні адной няма па вуліцах Баторыя, Верабея і Ліпавай. Тры забралі з вуліцы 3 Мая ды па адной з вуліц А. Зіна і Сцягеннага.

(яц)

Хутка вясна

У сакавіку, як заўсёды, прыйдзе вясна і ажывуць агароды. Многія агароднікі ставяць цяпліцы.

Маленькую цяпліцу можна зрабіць са старых ложкавых сценак. Яна лёгкая і няцяжка яе пераносіць. У такой міні-цяплічцы выгадна пасеяць цёплалюбівыя нізкарослыя раслінкі. Пакрыць цяплічку можна гатовай пластмасавай фольгай, або танней, пластамі зробленымі з пластмасавых бутэлек. Для гэтага трэба гарачай вадой змыць этыкеткі з бутэлек, абрэзаць у кожнай дно і горлышка, потым дакладна разрэзаць уздоўж. Атрымаюцца гладкія, празрыстыя пласты, якія трэба сшыць драцянымі скобамі. Такімі пластамі пакрыем сваю міні-цяпліцу. Дах будзе лёгкім і трывалым, устойлівым на дождж, град і вецер. Танна і добра.

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

Сто пяцьдзесят імпрэзаў у год

Размова з Сяргеем ЛУКАШУКОМ — дырэктарам Бельскага дома культуры.

Фота Міхася СЦЕПАНЮКА

— Колькі гуртоў, гурткоў і іншых форм дзейнічае ў Бельскім доме культуры?

— Сталых форм працы, а ідзе тут пра музычныя, тэатральныя, мастацкія ды танцавальныя калектывы, у гэтым годзе ў нас шаснаццаць. Даходзяць да гэтага яшчэ чатыры гурты, якія ў нас праводзяць рэпетыцыі або з намі супрацоўнічаюць.

У ліку музычных калектываў працуюць у нас „Васілёчкі", якія восенню будуць святкаваць 45-годдзе свайго існавання, Хор польскай нацыянальнай песні, які ў студзені адзначыў 15-годдзе, гурт „Маланка", якому ў лютым 2010 года здзейсніцца 20 гадоў. Варта ўспомніць мужчынскі хор „Куранты", які працуе ўжо шосты год ці маладзёжную студыю песні „Фарт".

Апрача гэтага супрацоўнічаюць з намі эстрадны гурт „Журавінка" з Пачатковай школы № 3, а таксама „Дзявочыя ноткі" з Бельскага белліцэя ды „Жэмэрва", якая дзейнічае пры Музеі малой айчыны ў Студзіводах, а ў нас праводзіць рэпетыцыі. Варта таксама ўспомніць гурт „Падляшскія зязюлі", які працуе пры Комплексе школ № 4.

Гаворачы пра іншыя формы дзеяння, трэба згадаць дзве мастацкія групы „Калаж" ды „Каларыт", а таксама тэатральны гурт „Антракт". Гэты апошні рыхтуе праграмы на польскай ды беларускай мовах. У сваіх прадстаўленнях паказвае, між іншым, абрады Бельскай зямлі.

Працуюць у нас танцавальныя групы: клуб бальнага танца, які існуе недзе ад пачатку 1990-х гадоў, ды клуб сучаснага танца. Апрача гэтага вядуцца заняткі аэробікі ды ёгі.

— Бачна, што моладзь вельмі актыўна ўдзельнічае ў дзеяннях Бельскага дома культуры.

— Трэба сказаць, што колькасць маладых, якія ўдзельнічаюць у нашых занятках, вельмі вялікая. Ва ўсіх нашых дзеяннях занятых больш за 400 чалавек. Вядома, у тым ліку ёсць таксама дарослыя. Гэта значная колькасць, улічваючы факт, што ўмовы працы ў нас цяжкія. Маем нямнога месца для заняткаў ці рэпетыцый. Распараджаемся сцэнай, глядзельнай залай і дзвюма заламі на другім паверсе. І ўсё гэта трэба каардынаваць. Праблемы паяўляюцца, калі трэба, напрыклад, зрабіць канцэрт. Прымушаны мы тады адмяняць заняткі іншых гуртоў. Шчыра кажучы, сам часам дзіву даюся, бо хаця ўмовы ў нас кепскія, заняткі вядуць 20 гуртоў і гурткоў.

— Вашы гурты выступаюць на многіх фестывалях ды конкурсах.

— У сярэднім кожны гурт дае 20 канцэртаў у год у краіне і па-за яе межамі. Але гэта ў сярэднім. Напрыклад, студыя песні „Фарт" выступае значна часцей. Прымаюць яны ўдзел у шматлікіх фестывалях і конкурсах песні ва ўсёй Польшчы, прывозяць многа прызоў. Дарэчы, хіба не было такога фестывалю, з якога члены „Фарта" не прывезлі б нейкай узнагароды.

— Якія зараз планы ў Бельскага дома культуры?

— Мерапрыемствы ў сакавіку, беручы пад увагу пост, будуць больш спакойныя. Няма вялікіх канцэртаў ці фестываляў. Адбудуцца перш за ўсё дэкламатарскія конкурсы, у тым ліку павятовыя адборы да агульнапольскага дэкламатарскага конкурсу. Плануюцца таксама мастацкія выстаўкі. Штогод пры канцы сакавіка арганізуем адукацыйна-культурнае мерапрыемства „Развітанне з зімой".

У гэтым месяцы адбудуцца ў нас таксама адборы да агульнапольскага конкурсу песні „Выйграй поспех" ды турнір бальнага танца. Вядома, увесь час будуць адбывацца заняткі згаданых ужо гуртоў і гурткоў.

— Колькі мерапрыемстваў арганізуе БДК на працягу года?

— Апрача сталых форм працы Бельскі дом культуры арганізуе ў сярэднім каля 150 імпрэз, якія маюць разнастайны характар і накіраваныя да розных груп насельніцтва: ад наймалодшых да дарослых.

Да найважнейшых мерапрыемстваў можам прылічыць дзіцяча-моладзевы агульнапольскі фестываль калядкі і пастаралкі „Кантычка", дэкламатарскія конкурсы на польскай і беларускай мовах, павятовыя конкурсы беларускай песні для дарослых, цэнтральныя элімінацыі беларускай песні для дзяцей і моладзі, міжнародны фестываль „Падляшская нота", канцэрт „Развітанне з летам", тэатральныя запусты, вечары царкоўнай музыкі, „Спасаўскія запусты", павятовыя артыстычныя прэзентацыі звышгімназічных школ.

БДК з'яўляецца таксама арганізатарам найбольшага мерапрыемства ў горадзе — „Дзён Бельска", якое сёлета адбудзецца ўжо трыццаты раз.

Апрача пералічаных мерапрыемстваў наш дом культуры выступае суарганізатарам дэканальнага фестывалю рэлігійнай песні „Падляшша", фестывалю ўкраінскай культуры „Падляшская восень" ды фестывалю беларускай бардаўскай ды аўтарскай песні „Бардаўская восень".

— З якіх крыніц Бельскі дом культуры атрымлівае грошы на сваю дзейнасць?

— У асноўным гэта самаўрадавая датацыя, якую прызначае нам бурмістр горада Бельска. Пішам таксама праекты ў іншыя ўстановы, перш за ўсё ў Маршалкоўскую управу. У гэтым годзе атрымалі мы ад іх датацыі на фестываль „Кантычка" і дэкламатарскі конкурс „Паэтычнае трохгалоссе". Гэты конкурс даволі цікавы. Кожны дэкламатар адзін верш чытае на польскай мове, а другі на беларускай, украінскай, расейскай, або на падляшскай гаворцы. На гэты год стараліся мы таксама атрымаць сродкі з Міністэрства культуры, але, на жаль, нашы праекты не перамаглі.

Яшчэ адна крыніца — гэта сродкі ад спонсараў. Напрыклад, на арганізаваныя намі „Дні Бельска" ад спонсараў паступаюць немалыя грошы. Спонсары даюць сродкі таксама на паасобныя мерапрыемствы меншага маштабу ды на дзейнасць нашых гуртоў.

— Якія зараз планы ў кіраванай вамі „Маланкі"?

— Думаю, што адной з найважнейшых падзей будзе выступ падчас 94 Сусветнага кангрэса эсперанта ў Беластоку перад трыма тысячамі дэлегатаў. Выступ гэты звязаны з тым, што ў 1993 годзе выступілі мы ў Францыі па запрашэнню эсперантыстаў з гэтай краіны. Арганізатары сёлетняга кангрэса звярнуліся да нас з просьбай выступіць з беларускім рэпертуарам. Ужо да гэтага рыхтуемся. Спяваем папулярную польскую песню „Шла дзевэчка до лясэчка" на мове эсперанта. Рыхтуем таксама нашу песню „Цвіце вяргіня", якую хочам праспяваць па-беларуску і па-эсперанцку. Напэўна будзем выступаць і на іншых мерапрыемствах ці фэстах. Штогод даем некалькі дзесяткаў канцэртаў. У гэтым годзе выступілі мы ўжо, між іншым, у Белавежы, Ласінцы ды на фестывалі „Беларуская песня", дзе занялі першае месца ў сваёй катэгорыі.

— Да юбілею 20-годдзя „Маланка" рыхтуе чарговы кампакт-дыск.

— Дарэчы, маем ужо запісаных 18 песень. Магчыма, што яшчэ ў гэтым годзе запішам дзве новыя песні. Будзе гэта ўжо трэці кампакт-дыск „Маланкі". Хочам яго выдаць восенню. Хачу дадаць, што дзейнасць „Маланкі", як і іншых калектываў БДК, фінансава падтрымлівае бурмістр горада. Ад многіх гадоў гурту „Маланка" фінансава дапамагае Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі. Дзякуючы гэтым сродкам маглі мы запісаць згаданыя 18 песень для новага кампакт-дыска.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Міхась СЦЕПАНЮК

Арлянскія канікулы

Міхал МІНЦЭВІЧ

У арлянскім Гмінным асяродку культуры (ГАК), нягледзячы на недахоп адпаведных памяшканняў, дзеецца шмат добрага. У гэтым галоўная заслуга дырэктар установы Анны Несцярук, якая большасць заняткаў з дзяцьмі і моладдзю ладзіць па-за сценамі гаспадарчага будынка, у якім змяшчаецца ейны офіс. Гэтак было і ў час зімовых канікул, насычаных мноствам цікавых мерапрыемстваў.

— У ладжаных з 26 студзеня да 6 лютага Гмінным асяродкам культуры разам са школай і Дабравольнай пажарнай камандай імпрэзах — гаворыць Анна Несцярук — удзельнічала каля дваццаці дзяцей з падставоўкі. Дзецьмі займалася я, а дапамагалі мне Эля Назарэвіч і Міраслаў Бало (шафёр, які нарыхтаваў вогнішча) ды ў школе настаўнік фізкультуры Ежы Грыгарук. Варта падкрэсліць, што калі летась удзельнікамі былі толькі мясцовыя дзеці, дык сёлета большасць была з па-за Орлі: з Кашалёў, Шарнёў... Давозілі іх бацькі. Я вельмі рада таму, што моладзь хацела праводзіць час у нашым асяродку і звонку яго, бо былі выезды.

Праграму канікул склалі мы супольна на аснове ранейшага вопыту. Дзеці з падставоўкі вынеслі прапанову пластычных майстар-класаў (заняткі адбыліся два разы з жыхаркай Орлі Крыстынай Грыгарук) і кулінарных, якія адбываліся амаль што другі дзень.

У першым тыдні ахвотныя маглі ў даабедні час (з 10-й гадзіны да 12-й) займацца спортам у гімнастычнай зале. У першы аўторак і другую сераду дзеці наведалі Беларускі музей у Гайнаўцы, дзе глядзелі фільмы. Транспарт — пажарную машыну „Люблін" — забяспечыла Гмінная ўправа; калі ахвотных было больш чым месц, машына выконвала два курсы.

З гайнаўскім музеем супрацоўнічаем здаўна і ў перыяд канікул наведваем тамашняе кіно. Пабачылі фільм „High School Musical" пра вучняў англійскай музычнай школы, які нашым дзецям вельмі спадабаўся. Даспадобы быў і другі фільм „Opowieści z Narni. Książę Kaspian". Фільмы гэтыя глядзелі таксама іншыя дзеці. Важнае для моладзі тое, што фільмы прэзентаваліся неўзабаве пасля іх прэм'еры.

У сераду, пасля поўдня, прыехаў у Орлю калектыў „Падляшскія кукулкі" з канцэртам. Былі спевы з акардэонам і танцы, а на канцэрт, які адбыўся ў школьнай гімнастычнай зале, з'явіліся і старэйшыя жыхары Орлі. Наступнага дня дзеці паехалі ў Нараўчанскую гміну, дзе вучыліся ляпенню ў гліне.

У другім тыдні ў Орлю прыехалі тры артысты тэатра „Narwal" з Беластока; гэты прыезд быў сфінансаваны за сродкі з Гміннай камісіі вырашання алкагольных праблем. У школьнай бібліятэчнай зале госці паказалі „Снежную каралеву", пра важную дзецям дружбу і вернасць. Пасля спектакля дзеці пад наглядам мастакоў выконвалі розныя лялькі з салявой масы, макароны, тканіны.

Пастаянным элементам зімовых канікул становіцца турнір па настольным тэнісе за кубак войта Арлянскай гміны, які сёлета адбыўся трэці раз. Спаборніцтва адбываецца ў трох намінацыях з падзелам на дзяўчат і хлопцаў ды доўжыцца адзін дзень. Лаўрэаты трох першых месц атрымліваюць кубкі. Сёлета ў турніры прынялі ўдзел госці з Нараўкі, а ўсіх стартавала дваццаць спартсменаў і спартсменак.

Фота Гмінны асяродак культуры ў Орлі

У намінацыі пачатковых школ сярод дзяўчат перамаглі Клаўдзія Лясота, Эмануэля Мірановіч (абедзве з Ляўкова) і Эльвіра Швед, а сярод хлопцаў Анджэй Банькоўскі, Матэвуш Назарэвіч і Куба Тхужэўскі (усе з Орлі). У катэгорыі гімназій перамаглі Кінга Кардаш, Юстына Грыц і Іаанна Станішэўская (усе з Ляўкова), а сярод хлопцаў Дамян Субота, Караль Казакевіч (абыдва з Ляўкова) і Радаслаў Сахарчук. У звышгімназічнай катэгорыі перамаглі ляўкоўскія хлопцы: Анджэй Гжыбоўскі, Лукаш Харкевіч і Эміль Анішчук. У гэтай намінацыі дадатковым атракцыёнам быў матч з арлянскім войтам (які выступае ў другой лізе настольнага тэніса); перамог войт Пётр Сэльвесюк, які высока ацаніў майстэрства свайго саперніка.

Харчаванне некаторыя дзеці прыносілі з сабою, але другое снеданне дзеці рыхтавалі тут самі; прадукты купляў ГАК. Маладыя кухары паказалі высокае кулінарнае мастацтва, бо рыхтавалі нават гарачыя стравы, напрыклад, хлопцы прыгатавалі запяканкі з макаронай. На гэтых занятках дзеці самі вырашалі што будуць рыхтаваць. Рэцэпты бралі нават з інтэрнэту і ў прынцыпе ўсе вырабы ўдаліся.

Канікулы патрабавалі шмат працы, як гэта з дзяцьмі, але асталося задавальненне. На завяршэнне канікул было вогнішча побач паветкі каля „Зялёнага дуба", было падпяканне каўбасак, бігас. Крыху перашкаджаў дождж, дык вярнуліся ў будынак ГАКу, дзе адбылося падсумаванне і ўручэнне памятных узнагарод.

Мяркую, што дзеці былі вельмі задаволены, бо ўжо дапытваліся, ці такія канікулы будуць у наступным годзе, — падсумавала спадарыня дырэктар.

А я спытаў яшчэ пра тое, аб чым ідуць у нас эмацыянальныя гаворкі:

— Даведваемся, што пры арлянскім ГАКу ўзнік ці ўзнікае новы калектыў, аднак аб ім гаворыцца неяк прыцішана, бо гэта хіба ўкраінскі калектыў. Ходзяць чуткі, што яго заснавальнікам з'яўляецца спадарыня дырэктар, іншыя кажуць, што Марэк Хмялеўскі з Орлі, які даведаўся, што ён украінцам?

— Я магу сказаць, што такая ініцыятыва выйшла ад мяне і яшчэ ад некалькіх асоб, што спрабуем, можа збярэмся і створым калектыў. Але найбольшая праблема з інструктарам. Знайшоўся інструктар з Украіны, але пасля размовы з ім я заявіла, што хачу, каб у рэпертуары былі тыповыя песні з нашай гміны. Значыць, дала яму дадому спеўнікі Сцяпана Копы плюс іншыя тэксты, нашы, беларускія.

Інструктар Юры Кавальчук паходзіць з Украінскага Палесся, з Роўнага, іграе на акардэоне і спявае. Прызнаўся ён, што і ў іх спяваюць такія як і ў нас песні, толькі на крыху іншы напеў. Вядзе ён калектыў у Парцаве ды, мабыць, мае прапанову і з Чаромхі.

Зараз новы калектыў налічвае дзесяць асоб, палову з якіх складаюць працаўнікі Гміннай управы. Ёсць чуткі... Мы многа гутарылі на беларуска-украінскія тэмы, і сказалі: мы не вызначаемся, мы хочам спяваць песні, трымацца арлянскай традыцыі. Назвы мы яшчэ не прынялі, але можам назвацца і „Тутэйшымі".

Карыстаемся спеўнікамі Сцяпана Копы, спяваем па-свойму. Усе хочам прыняць удзел у найбліжэйшым конкурсе беларускай песні. Спяваем ужо „Як поехаў наш Іван" (песня з вёскі Кошкі), „Там у полі озэрэчко" (Крывятычы), „Колі каліна нэ цвіла" (Кашалі), „Туды гора" (Малінікі) і „Куды едэш Купрыянэ" з рэпертуару інструктара, у які мы ўносім папраўкі на наш манер.

Спадзяюся, што новы калектыў будзе развівацца, пабачым, як справы будуць ладзіцца пасля першых выступленняў. Кіраўніком калектыву мабыць буду я, бо тут жа заўсёды шмат арганізацыйных спраў.

— А калектыў „Арляне" яшчэ трымаецца? (у ім у большасці пажылыя жанчыны)

— Трымаецца, гэта прыгожы калектыў і я іх вельмі паважаю. Яны быццам гаснуць, гаснуць, але ўсё яшчэ знаходзяць у сабе сілы; цяпер калектыў папоўніла Вера Таранта з Кашалёў.

Пры ГАКу дзейнічаюць яшчэ маладзёжны калектыў „Фармата" і дзіцячы „Арлянскія званочкі", значыць цяпер усіх чатыры калектывы.

— Дзякую за размову.

Замалёўкі з падарожжа

Надыходзіць вясна. Натура будзіцца з дрымоты. Час вырвацца з чатырох сцен. Рашыў і я з'ездзіць у Беласток ды сяброў праведаць. Рэйкавы аўтобус з Чаромхі у 6:44 штодзень запоўнены.

У Кляшчэлях у цягнік зайшло некалькі школьнікаў (старэйшыя карыстаюцца аўтобусным транспартам або падарожнічаюць на сваіх аўтамабілях). На прыпынку ў Сухавольцах перон пуставаў, а руіны разбуранай пачакальні больш напаміналі Дзікі захад, чым III Рэч Паспалітую. У Рыгораўцах да мяне падсеўся малады мужчына. Гаварыў, што падаецца за Ольштын. Пакарыстаўшыся нагодай даўжэйшага падарожжа, наладзілі мы размову. Незнаёмец аказаўся гаваркім кампаньёнам.

— Дамоў вяртаюся, — патлумачыў. — У Дыдулях гасцяваў, сястрыца там замужам.

— Як у гэтыя мясціны яна трапіла? — пытаю.

— У Ольштыне пазнаёміліся, калі працавала прадаўшчыцай. Раз усяго ў Вульку-Выганоўскую з'ездзіла, бо адтуль хлопец выходзіў. Спадабаліся, ды вяселле згулялі. Швагер дом у Дыдулях купіў. Паўгода будзе як перасяліліся...

— Ды як жа маладым жывецца на вёсцы? — пытаю, каб падтрымаць размову.

— Някепска. Суседзі добрыя трапіліся. Ёсць да каго зайсці, пагаварыць...

У час далейшай размовы субяседнік выявіў, што швагер працуе на гаспадарцы ў прадпрымальніка непадалёк Паўлінова, а сястра наглядае за домам. Сам ён працуе ў прыватніка пекарам. Месячна атрымлівае 1200 злотых.

— А якія цэны на Паазер'і? — цікаўлюся.

— Бохан хлеба, напрыклад, каштуе 1,60 зл., а булачка 25-30 грошаў. Горш з мяснымі вырабамі, — канстатуе суразмоўца. — За звычайную каўбаску трэба заплаціць 16-17 злотых, за лепшую вяндліну — больш за дваццаць. Многія ад нас у Беласток ездзяць ды свініну „жыўцом" купляюць. Забіваюць у гаспадара вепручка ды на месцы вырабы вэндзяць. Кажуць, што пры такой здзелцы лепш пяцьсот злотых пераплаціць, чым хіміяй карміцца. Затое прамысловыя тавары ў нас напалову таннейшыя, — паясняе суразмоўца. — У Мышынцы, мястэчку ад нас адлеглым на 40 кіламетраў, канапу можна купіць за пяць соцень, калі ў Бельску такая каштуе 940 зл.

Хутка прайшоў час на размове з гаваркім кампаньёнам. Мінулі станцыю „Стадыён", сталі набліжацца да цэнтральнага вакзала, мэты нашага падарожжа. Там і развіталіся.

Уладзімір СІДАРУК

СПАЧУВАННІ

Спадарыні Марыі Луба
і яе родным
словы спачування
з прычыны
сустрэўшага іх гора
смерці бацькі

выказваюць: „Ніва", Беларускі Саюз, Беларускае гістарычнае таварыства, Цэнтр грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь.

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Фота Адама ПАЎЛОЎСКАГА

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Аўгустова ў „Ніве”

— Вашая экскурсія — гэта ўзнагарода за добрыя ацэнкі? — пытаем нашых гасцей, вучняў пачатковай школы і гімназіі ў Аўгустове, што каля Бельска.

— Не, гэта кара, — жартуе іх настаўнік Ігар Лукашук. — Пасля сустрэчы трэба будзе прачытаць кніжкі!

У пятніцу 6 сакавіка г.г. рэдакцыю „Нівы” наведалі навучэнцы беларускай мовы з Аўгустова. Наша сустрэча была прысвечана чытанню газет і кніжак. Сучасны гімназіст рэдка заглядае ў бібліятэку. Хутчэй чым кніжку ён выбярэ інтэрнэт ці супермабільнік, у якім можна прачытаць кніжкі і газеты. Такі падыход выгадны і варта вывучаць тэхнічныя навінкі. Нішто аднак не заступіць жывога кантакту з кніжкай, газетай ці яе аўтарамі. У час жывых сустрэч кожны запамятае нешта важнае для самога сябе, падумае пра сваё месца ў жыцці і найважнейшыя справы. Для ўсіх нас важныя нашы людзі, беларуская мова і культура, нашы прырода і гісторыя. Важнае месца на культурнай карце Беласточчыны займае мяшчанскае сяло Аўгустова. Жыхары гэтай мясцовасці заўсёды цанілі асвету і культуру. Аўгустова можа ганарыцца слаўнымі выхадцамі. Адсюль продкі выдатных паэтаў Надзеі Артымовіч і Юры Плютовіча.

Мы, вядома, заахвоцілі нашых гасцей вывучаць гісторыю і культуру сваіх вёсак — бо сярод аўгустоўскіх школьнікаў не было мясцовых. Усе сябры даязджаюць з вёсак, практычна з усёй Бельскай гміны. У якасці падарункаў вучні атрымалі навейшае выданне „Нівы” — кніжку Сяргея Чыгрына пад загалоўкам „З Беластоцкай зямлі”.

Пасля сустрэчы ў рэдакцыі вучні наведалі яшчэ Радыё „Рацыя” і схадзілі ў кіно.

ЗОРКА

Оля Яроцкая

вучаніца першага „а” класа ў Гарадку. На ўроках беларускай мовы Оля любіць апавядаць пра сваю сям'ю, пра свае зацікаўленні. Дзяўчынка любіць казкі і песні. Яна спявае ў дзіцячым калектыве „Казка”. Гэты гурт вядуць настаўніцы пачатковага навучання спадарыні Марыя Абрамовіч і Кася Кокець. Яшчэ ў дзіцячым садку Оля Яроцкая прымала ўдзел у дэкламатарскім конкурсе „Роднае слова”. Сёння друкуем яе вершык пра „Коціка-псоціка”. Вершык нам спадабаўся. Пабачце самі!

Коцік-псоцік

Бацька паставіў плоцік,
На плоцік ускочыў
наш коцік-псоцік.
Прыбег сабачка суседаў,
Гаў-гаў і коціка прагнаў!

ОЛЯ ЯРОЦКАЯ
Клас I „а”, ПШ у Гарадку

Фота Анны ГЖЭСЬ

На здымку: сядзяць (злева) Бартак Нос, Оля Яроцкая, Бэата Пухальская, Сандра Грыцук, Лукаш Мурашкоўскі. У другім радзе: Матэвуш Трэска, Адрыян Ягораў, Моніка Шыманюк, Габрыся Красоўская, Габрысь Пятэльскі, Куба Сергіевіч.

Міра ЛУКША

Барсук з Барсуковіны

Барсучок нару капае.
Любіць хату мець ён з краю,
каб чужацкая праныра
не заглянула ў свіран,
каб ніякі індывід,
прымяняючы свой спрыт
не надумаў барсуку
пабарсучыць на таку,
не забраў дабра і плёну
(хай і грошык, хай — мільёны)!
Не на тое ж гаспадар
працаваў, збіраў тавар,
каб які лодыр-лянота
пасцягаў усё ўпотай
і хоць каліва адняў
з таго, што барсучок сабраў!
Добры бацька, гаспадар
для сям'і — каштоўны дар!



Зося з першага „а” класа

— 21 —

Сакавік і красавік — апошнія месяцы для трэцякласнікаў. Гэта час на вызначэнне новага школьнага самакіравання, таму што ў II Агульнаадукацыйным ліцэі старшынёй школьнага самаўрада дагэтуль быў Міхал Тычка з III „ц” класа.

Сярод вучняў малодшых класаў не было кандыдатаў на гэты ганаровы пост. Настаўнікі рабілі ўсё, каб заахвоціць моладзь, але ні адна асоба не праявіла гатоўнасці стаць кіраўніком школьнага самакіравання. Пасля двух тыдняў знайшліся, аднак, дзве кандыдаткі, якія рашылі пазмагацца на выбарах. Калі хлопцы з першага „а” класа пабачылі першую кандыдатку, яны былі прыгнечаны. Дзяўчына была малая і „шэрая”. Яе ніколі раней не бачылі на школьным калідоры.

— Не аддам свайго голасу на гэтую Марысю! — аб’явіў Пеця. — Яна, як дзяўчына, мне не падабаецца.

— Я таксама не буду галасаваць, — падтрымаў сябру Філіп. — Паглядзіце, якая ў яе нямодная прычоска.

Зося не хацела слухаць гэтай дурной крытыкі. Яна мела іншы погляд, чым хлопцы. Ёй Марыся падабалася. Яна прапанавала вучням шмат культурных мерапрыемстваў, сустрэч з пісьменнікамі і рок-музыкантамі. Хлопцы з нецярплівасцю чакалі чарговую кандыдатку. Голас у гэтай справе ўзяў Янка Рыбачук.

— Вось! Можа яна не прыкладная вучаніца, — уздыхнуў выхавацель першага „а” класа, — але мае волю стаць контркандыдаткай, пазмагацца на выбарах. Можа і яна прыдумае нейкія мерапрыемствы для школы...

Апошні сказ выхавацель сказаў без самаўпэўненасці.

— Хто гэта? — дапытваліся хлопцы.

— Наша Клара! — адказаў Рыбачук.

Усе змоўклі. Пасля адазваўся Паўл Пятрушэня, якому фарбаваная бландзінка параніла сэрца:

— У такім выпадку я аддам свой голас на Марысю! — заявіў.

Ужо ў першы дзень выбарчай кампаніі Клара развесіла ў ліцэі процьму сваіх ружовых плакатаў. Іх можна было пабачыць у кожным закавулку, у кожным закутку... Калі моладзь з іншых ліцэяў наведвала II Агульнаадукацыйны ліцэй, не верыла ў такую перамену школы:

— Я была ўпэўнена, што ў вас самі рокерсы і металы, — гаварыла адна сяброўка Зосі. — А тут бачу шмат *пакемонаў*!

Як неўзабаве аказалася, вучні ліцэя не былі падатлівыя на вабнасць фарбаванай бландзінкі. На выбарах бліскуча перамагла непрыкметная Марыся.

Цяпер на перапынках шэпчуць, што сам Паўл Пятрушэня дапамог ёй у ціхай выбарчай кампаніі. Гэта мела быць адплата Клары за здраду ў „Валянцінкі”.

Тэкст: wodorotlenek92@wp.pl
Дызайн: majeszkarowu@tlen.pl

Музыка з кайфам

Дзеці дзецям ці „Дзецідзяцей”

Удаваць дзяцей не мусім, бо кожны з нас, малады ці стары — дзіцё сваіх бацькоў. Аднак наша дзяцінства з’яўляецца важным успамінам, часам важным сімвалам. Увогуле да дзіцячага ўзросту падыходзім з пашанай, сентыментам, але і з аптымізмам. Гэтыя пачуцці разбуджае ў слухача таксама гурт „Дзецідзяцей”. У арыгінальным запісе музыкі карыстаюцца рускай мовай, але ў іхняй творчасці крок за крокам паяўляюцца і беларускія акцэнты. Хаця б апошняя песня „Гімн моладзі”, якая з’явілася ў інтэрнэце ў новым запісе на беларускай мове. Гэта такі падарунак слухачам з нагоды надыходзячай вясны, якой першым знакам з’яўляецца першы дзень сакавіка. Сакавік — сакавіты, а музыкі — самавітыя.

Гурт „Дзецідзяцей” паўстаў у 2005 годзе. Усё пачалося з неспадзяванай

думкі падарыць рэжысёру спектакля „Івонна” песню. Падарунак спадабаўся не толькі яму, але і самім выканаўцам. Зразумела тады, што гурт заснавалі прафесійныя акцёры. Зараз надалей працуюць яны ў гурце і адначасова ў калектыве Купалаўскага тэатра ў Мінску. Апрача акцёраў гурт „Дзецідзяцей” ствараюць прафесійныя музыкі ды вялікая зорка беларускай інструменталістыкі — віяланчэлістка Юля Глушыцкая, вядомая хаця б з гурту-легенды „Новае неба” ці з праекта „Народны альбом”. Як бачыце, гэтыя „дзеці” зусім па-дзіцячаму не думаюць. Наадварот, працуюць заангажавана і спела, таму расце папулярнасць гурту ў розных кругах. Канцэртуюць яны не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі. Перамагаюць у конкурсах, напрыклад, „Залатая акустыка”, а год таму атрымалі „Рок-карону” за самы лепшы дэб’ют.

Лідарам каманды з’яўляецца Ганна Хітрык. У Ані воблік прынамсі на дзесяць гадоў малодшы, чым яе сапраўдны ўзрост. Да гэтага ў яе магутны голас, дзякуючы якому трымае слухача ў няўпэўненасці: што зараз будзе? Гэта ж, вядома, акцёрскі талент, якога, аднак, не бракуе ўсяму гурту.

Вясна ўжо ля парога. Больш прыемна будзе сустракаць яе з музыкай гурту „Дзецідзяцей”, якая аптымістычна настройвае і дае энергію.

i_basovka@o2.pl

Вершы Віктара Шведа

У сне мясіў балота

Здзіўленая рана мама,
Сын спаў з бруднымі нагамі.
— Як спаць у пасцелі мог
Не памыўшы раней ног?

— Не вінаваты я нічога.
Бо меў чысценькія ногі.
І таксама не лянота.
Я ж у сне мясіў балота!

Дзіўны час

Кажа Ясь:
— Настаў час нехарошы,
Навокал чую:
— грошы, грошы, грошы.
Ды яшчэ вытрымаць матчыма,
Калі жывецца нам з грашыма.

Алесь на гэта:
— Мне марыць дарма.
Чую я толькі: — Грошай няма!
І як тут марыць аб раскошы,
Калі зусім не маем грошай.

Польска-беларуская крыжаванка № 11

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 7:

Рампа, но, ды, жанр, кут, Адам, штучка, птушка, лан, тата, ла, тын, кумір. Нюх, рожкі, ты, штат, паратунак, душ, качка, думка, Лі, рыт, дар.

Узнагароды, аўтаручкі (самапіскі), выйгралі **Юстына і Рафал Вакулюкі** з Арэшкава, **Марыёля Анішчук, Агата Грыгарук, Юстына Тамашук** з Дубін, **Агнешка Мароз** з Гайнаўкі, **Габрыеля Снарская** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!



Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Па слядах мінулага

З Беластока ў паўднёвую частку нашага Падляшскага ваяводства можна найраней дабрацца на публічным транспарце толькі каля дзевятай гадзіны раніцы, ды і то толькі ў Сямятычы. У тамашнюю далейшую глыбінку заехаць раней можна толькі з іншага адпраўнога пункта...

Калісь з Гайнаўкі сярод ночы выязджаў у Варшаву непасрэдны поезд, які ў народзе так і называлі — „варшавяк". Эпоха начных паяздоў з нашых чыгуначных станцый канула ўжо ў Лету. Аднак нейкі ўспамін „варшавяка" яшчэ цалкам не спіць, яшчэ на зімовым досвітку адпраўляецца ў сталічным напрамку. У гайнаўскім раскладзе паяздоў ён быццам едзе ў Седльцы, але ў сутнасці ён толькі ў Чаромху, дзе трэба шпарка перасядацца; гэтым курсам карыстаецца яшчэ шмат — па сённяшніх тутэйшых чыгуначных мерках — пасажыраў.

Аднак чыгунка ў нас аддаляецца ад людзей, хаваецца ў лес. Яшчэ дзе-нідзе стаяць на чыгуначных абочынах прызмы драўляных паясоў платоў, якімі калісь гарадзілі чыгуначныя лініі ад задування снегам. Сёння тыя платы ўжо непатрэбныя, і то не з-за таго, што ў выніку кліматычных змен зімы сталі менш зімовымі. Цяпер наша чыгунка абгароджана лесам. Яшчэ дзе-нідзе да чыгуначнага пояса прылягае лапік поля, нейкая палянка, якая найчасцей ужо пад чарговай пасадкай, або яшчэ пад аблагом...

Чыгуначная станцыя Сямятычы аддаленая ад самога горада на нейкіх пяць кіламетраў і да некаторых паяздоў выязджаюць пэкаэсаўскія аўтобусы. Карыстаюся такім і я. У чацвер, значыць у сямятыцкі тарговы дзень, з поезда ў Сямятычы еду толькі я. Недзе пасярэдзіне маршрута, з прыпынку Анусін-Калёнія, аўтобус падбірае яшчэ парку школьнікаў ліцэйскага ўзросту... Нашы вёскі памаленьку становяцца бязлюднымі выспамі...

Кругавым аўтобусам, які з Сямятыч па навакольных вёсках адпраўляецца ў тыя ж Сямятычы цераз Драгічын, таксама выязджае нямнога пасажыраў; магчыма, што пазней назбіраецца больш — у школы ці на працу. Пакідаю аўтобус на прыпынку Лапушы, што па сямятыцка-цеханавецкай змарнелай асфальтоўцы.

З асфальтоўкі ў самі Лапушы жвіроўка, якая на прадвесні аздобленая мазаікай калюжын; у вёсцы брукавы насціл вуліцы. Вёска Лапушы не надта вялікая — можа з дваццаць панадворкаў. Народ тут быў узяўся браць справы ў свае рукі, але ў гэтай эканамічнай гонцы не ўсе дабеглі да мэты — відаць пустыя агромністыя гаспадарскія збудаванні побач гэтаксама пустых і вялікіх мураванак. Па Лапушах залягае пах гнаёўкі — атрыбута цяперашняга вясковага поспеху. Дарэчы, вядомы румынскі мысліцель-песіміст Эміль Чоран, які быў часта згадваўся і на нашых старонках, прарочыў, што чалавек ад гною — нягледзячы на ўсялякія прагрэсы — не вызваліцца...

З Лапушоў кіруюся ў бок Наройкаў па пазначанай на карце дарозе. Дарога тая вытрасіравана не толькі на карце, але і на месцы. Аднак яе палотнішча мала хіба адрозніваецца ад таго, якое тут ляжала ў эпоху панавання галіцкага князя Данілы Раманавіча, які ў 1254 годзе каранаваўся ў Драгічыне на караля. А згадваю пра гэта таму, што абедзве згаданыя вёскі спакон вякоў у складзе Драгічынскай зямлі, а па сённяшніх мерках — у Драгічынскай гміне. А сама дарога гэта абмежаваны раўчакамі пояс гразі з прымессю жвіру, якая давеснавой раніцай яшчэ не размерзлася. Па такой дарозе ў пару палявых работ вельмі складана вывесці ў поле сельскагаспадарчую тэхніку, сяляне патрабуюць ад Гарадской рады рамонту дарогі, пакуль беспаспяхова.

Курган каля Цацэляў

Тут, у заходняй частцы Сямятыцкага павета, людзі трымаюцца поля, не засаджваюць яго лесам, так як у Мельніцкай, Мілейчыцкай ці Нурэцкай гмінах: мо зямля тут лепшая, а мо сфармаваўся тут іншы сялянскі менталітэт. Але ўсё ж такі заўважаю невялікі кліночак бярозавай пасадкі каля дваццацігадовай даўнасці.

Праходжу край невялікіх наройчанскіх могілак, дзе мірна суіснуюць два галоўныя тутэйшыя алфавіты — кірыліца з лацінкай. Відаць, аднак, што напрамак у Заходнюю Еўропу пракладаюць не толькі нашы варшаўскія палітычныя эліты, але і тутэйшы народ прымяненнем намагільнага алфавіту згаджаецца з гэтым выбарам. Нават на крайняй ад дарогі сужонскай магіле эпітафія мужчыны, які памёр у 1978 годзе, напісаная яшчэ кірыліцай, а ягонай жонкі, што прамінула ў 2000-м — ужо лацінкай...

Ідучы з боку Лапушоў, найбольш у Наройках кідаецца ў вочы вялікі мураваны школьны будынак; апынуўшыся ў вёсцы падаўся я пабачыць яго. І пабачыў я невясёлае. У шчытавой частцы таго будынка з боку вёскі, на першым, грунтавым паверсе жыве нейкае сямейства, на што паказвалі развешаная на панадворку вопратка, цэлыя шыбы ў вокнах ды прыбітая — заміж да сцяны — да прыдарожнай, адлеглай ад будынка на нейкіх трыццаць метраў, таполі „талерка" спадарожнікавай антэны. Пазней даведаўся я, што жыве там нейкая сям'я з Драгічына, пераселеная туды рашэннем гарадскіх улад гміннага цэнтра. Школа ў Наройках была закрыта ў 2001 годзе, а нешматлікім дзецям давялося, мабыць, здабываць падставовыя веды ў адлеглых на амаль дзесяць кіламетраў Астражанах. Пазней будынак прайшоў розныя выпрабаванні, ад якіх асталіся відавочныя звонку пазбаўленыя шыб аконныя праёмы. На школьным панадворку асталіся яшчэ іншыя меншыя збудаванні, да таго ж панадворка прымыкае і мураваная паветка аўтобуснага прыпынка, пра якія пісаць не буду, бо ж яны, так як і падобныя ім збудаванні, салонамі не з'яўляюцца.

Праз вуліцу ад былой школы стаіць у Наройках царква. Першая вестка пра прыход у Наройках паходзіць з першай паловы 17-га стагоддзя, хаця па ўскосных прыметах выпадае меркаваць, што, тады старая, драўляная царква была ўжо там у давуніяцкі перыяд. Не было тады ў ёй ні прытвора, ні званіцы. У 19-м стагоддзі Наройчанскі прыход быў адным з найбяднейшых у Гродзенскай губерні і пасля ліквідацыі ўніі мітрапаліт Іосіф Сямашка хадайнічаў за дафінансаваннем яго; варта дадаць, што ў падобнай сітуацыі былі таксама прыходы ў Кузніцы, Васількаве, Суражы, Харошчы, Цеханоўцы і Журобічах. У прыходах, якія атрымлівалі такое дафінансаванне, нельга было патрабаваць ад сялян прыгону на папоўшчыне. У 1863 годзе пачалася ў Наройках пабудова новай, мураванай царквы, якая была здадзена ў карыстанне 8 лістапада 1866 года. Дарэчы, яе будова працягнулася і да цалкам нядаўняга часу, калі ў 2007-2008-х гадах над прытворам была ўзведзена званіца; дабудаваны фрагмент яшчэ не закончаны, яшчэ не атынкаваны, яшчэ забітыя аконныя праёмы (у вугле цвінтара стаіць і асобная невялічкая званіца). Пры нагодзе абнаўлення царква была перакрыта новай бляхай.

У Наройках дзве прыватныя крамы, бо вёска яшчэ дыхае; тут таксама рыхтуецца, пакідаючы мужыкам непрыемны пах, сыравіна для гарадскіх паноў. Тут таксама відаць вынікі рознага змагання вяскоўцаў з новымі грамадска-эканамічнымі выклікамі: адны будынкі выпраменьваюць свежую энергію, іншыя памаленьку гібеюць. Варта яшчэ дадаць, што да 1934 года была ў Наройках сядзіба гміннай управы, якая пазней была перанесена ў Драгічын, а частка тэрыторыі ранейшай Наройчанскай гміны была далучана да Сямятыцкай і Гродзіскай гмін.

Кіруюся ў напрамку Сківаў. З Наройкаў у Сківі выходзіць набрынялая вадой жвіроўка. І вось недзе пасярэдзіне адлегласці між дзвюма гэтымі вёскамі па дарожным палатне зараз відаць, дзе канчаецца Драгічынская гміна, а дзе пачынаецца Сямятыцкая: гэта там, дзе канчаецца жвіроўка і пачынаецца асфальтоўка. Дарэчы, тая асфальтоўка даволі маладая, бо рашэнне пра пракладку на ёй асфальтавага насцілу сямятыцкія радныя прынялі пад восень 2007 года.

Царква ў Наройках

Сківі-Малыя і Сківі-Вялікія прылягаюць да сябе. На сутыку гэтых вёсак расхадныя дарогі, побач працуе крама. У Сківах-Малых адна хата выконвае з 1980 года касцельную ролю; пра гэта сведчыць маленькая вежка з крыжам на месцы ранейшага коміна.

Побач шашы са Сківаў у Цацэлі відаць аброслы бярозамі круглы курган з крыжам і кіотам. Гэта не адзіны курган у абшары вёскі Цацэлі. У 1966-1970 гадах былі тут праведзены раскопкі, якія выявілі звыш паўтысячы асобных магіл і восем курганных дыяметрам у 15-20 метраў перыяду ад 2-га стагоддзя да нашай эры па пятае стагоддзе нашай

эры. Тадышняе тутэйшае насельніцтва займалася земляробствам, а эліты былі ўжо загледжаны на Еўропу, бо ў цацэльскіх курганах былі знойдзены рымскія манеты. Ды не толькі ў Цацэлях дагістарычныя курганы, яны і ў абшары навакольных мясцовасцей...

У Цацэлях шмат помнікаў і з царскага перыяду. На адным з іх маленне за ваенны поспех: „Силою Креста Твоего сохрани и спаси Господи братьевъ нашихъ воиновъ. Отъ девицъ д. Цецели 1915 г." На іншым, з мая 1914 года: „Избавъ Господи весь сію и всю страну отъ глада губительства потер и огня и всякія смертоносныя язвы".

У аддаленым ад вуліцы прысёлку заўважаю характэрны, для невялікіх у мінулым школ, аднапавярховы драўляны будынак. Пытаю пра яго жанчыну, якая акурат выйшла каля мяне на вуліцу. Адказала яна мне, што раней была ў тым будынку школа, але калі яе закрылі — не ведае. Затое інфармуе мяне, што жыве там адна кабета, якой згарэў недалёкі дом. Да таго ж яшчэ памёр ёй муж і яна ўзяла сабе каханка, з якім і жыве ў тым школьным будынку.

У Цацэлях шмат хат старых, ёсць, як і ў кожнай цяперашняй вёсцы, пустыя. Адну старую хату ейны ўласнік расцягнуў трактарам і так яна асталася ляжаць. Увагу вандроўца можа прыцягнуць мураваная прыдарожная каплічка, таксама з царскага часу. А маю ўвагу, у прыватнасці, прыцягнуў мяккі асфальт пад нагамі, які, здаецца, пралівае святло на поспех асфальтавання дарог у Сямятыцкай гміне: у Цацэлях асфальт вылілі проста на жвір...

Даганяе мяне мужчына на веласіпедзе, заводзіць гаворку. На рулі свайго ровара вязе пластмасавы мяшочак бульбы, якую ўзяў у суседа праз некалькі хат. Гутарка з ім атрымалася на свой лад цікавай, бо чалавек аказаўся цікавым мясцовага мінулага. Хаця пад ягонай старэнькага дызайну хатай пралягае лінія водаправода, ён карыстаецца студняй, бо на падключэнне да водаправода няма ў яго грошай. Падалося мне, што ён больш увагі прысвячае тэарэтычным аспектам жыцця, чым выклікам яго практычных патрабаванняў... Можна было б сумнявацца ў праўдзівасці яго — мужыка, што возіць бульбу на веласіпедзе — гістарычным ведам, але інфармацыі, абнародаваныя сур'ёзнымі гісторыкамі, ускосна пацвярджаюць простанародную памяць аб мінулым.

Калісь недалёка ад Цацэляў быў панскі двор, — расказваў ён — а ягоныя ўласнікі пакінулі па сабе нядобрыя ўспаміны, бо былі вельмі жорсткімі ў адносінах да сваіх прыгонных. Прабабка майго суразмоўцы была расказвала, што мясцовае насельніцтва пан з ксяндзом заганялі да будовы сямятыцкага касцёла; сапраўды, 6 лютага 1456 года Міхал Кміта заклаў у Сямятычах касцёл, якому даў на ўласнасць вёску Цацэлі. Мясцовыя сяляне вымушаны былі цяжка працаваць, а ксёндз з панам былі бязлітасныя. Калі хто не надта шчыра прыкладваўся да працы, таго заганялі ў дыбы, білі і да таго ж яшчэ паролі нажом у задніцу каб спусціць крыху крыві; жорсткіх катаванняў не выдумалі ў наш таталітарны час, яны практыкаваліся спакон вякоў, а пісаныя на панскай паперы дакументы згадваюць адно пра станоўчыя рысы паноў, замоўчваючы іх рысы адмоўныя.

Малітоўная хата ў Сківах-Малых

Мясцовы пан — прадаўжаў мой суразмоўца — задумаў выкапаць сажалку каб разводзіць сабе рыб. Капалі тую сажалку прыгонныя мужыкі, а жанчыны выносілі на бераг зямлю ў прыполах. Калі тут настаў цар, зліквідаваў унію і ўніятам трэба было далей або ісці ў касцёл, або ў царкву. Перад драгічынскай уніяцкай царквой былі тады паставілі салдата, які гаварыў, што ўжо там маліцца „нельзя". А чаму ў Наройках не збудавалі былі званіцы разам з царквой? Бо тамашнюю царкву будаваў празмерна вясёлы народ, які частку грошай, адведзеных царом на будову царквы, звычайна прагуляў і на званіцу не хапіла; праўда гэтая можа і не сутнасная, але вельмі фальклорная. А школу ў Цацэлях паставілі пасля вайны. Будынак прывезлі з нейкай вёскі паблізу Буга. Пазней, калі ў Наройках пабудавалі новую плябанію, тамашні бацюшка аддаў старую ў Цацэлі, і з яе да існуючай ужо школы дабудавалі флігель; школу закрылі ў 1997 годзе. Вёска Цацэлі зараз належыць да Рогаўскага прыхода, але калісь была ў Наройчанскім. Мясцовыя вернікі, аднак, не захацелі быць пры Наройках, бо тамашнія могілкі нізкія і вада залівала магілы.

На канцы Клюкава, з боку Рогаўкі, абапал дарогі стаяць насупраць сябе два крыжы: праваслаўны цэментны з эпохі цара Мікалая (30 мая 1915 года) і каталіцкі жвіровы (grysik) з эпохі цара Эдварда (30 красавіка 1974 года). Надпіс на апошнім даволі тыповы (Od powietrza głodu ognia i wojny zachowaj nas Panie...), больш канкрэтны на першым (Спаси Господи люди Твоя и благослови поля сія жатвою обильною...) Цікавае, аднак, тое, што намнога лепш захаваўся надпіс старэйшы на амаль шэсцьдзесят гадоў.

У Рогаўцы побач сябе два помнікі даўніны з паловы XIX стагоддзя. Драўляны школьны будынак цяпер выконвае жыллёвую ролю. Зараз за ёй, на гары, драўляная могілкавая царква з 1858 года, пабудаваная жыхаром Рогаўкі Сымонам Шумам, крыху далей стаіць званіца. Перад царквой тры старыя цэментныя помнікі, пастаўленыя прыхаджанамі: адзін паставілі жыхары Крупіч і Буякоў, другі — жыхары Рогаўкі і трэці — жыхары Клюкава і Цацэль. Помнікаў даўніны тут больш, бо тут і дахрысціянскія сярэдневяковыя могілкі. І бетонныя крыжы пры вуліцы насупраць царквы з пачатку XX стагоддзя, і з боку Сямятыч крыж на каменным пастаменце з 1901 года. Сама вёска Рогаўка занадта не розніцца ад іншых тамашніх вёсак, хаця можна тут заўважыць подых недалёкіх Сямятыч, дзе на ўчастках паміж Рогаўкай і Сямятычамі відаць вытворчыя комплексы, вырастаюць новыя катэджы.

Царква ў Рогаўцы

Конкурс „Пазнай Беларусь"

Калі вы цікавіцеся гісторыяй, культурай Беларусі, яе сучасным жыццём, калі вы актыўныя творчыя асобы, — прапануе вам удзел у конкурсе „Пазнай Беларусь" Культурны цэнтр Беларусі пры Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча.

Мэта конкурсу — папулярызацыя сярод маладога пакалення беларусаў у Польшчы ведаў пра культуру, гісторыю і сучаснасць Беларусі, садзейнічанне рэалізацыі творчага патэнцыялу дзяцей і моладзі беларускай меншасці ў Польшчы, зацікаўленне грамадскасці праблемай захавання нацыянальнай самасвядомасці сярод беларускай моладзі ў Польшчы.

У конкурсе могуць прымаць удзел вучні, творчыя калектывы, гурткі навучальных устаноў у Польшчы ва ўзросце **ад 3 да 18 гадоў**. Да ўдзелу ў конкурсе прымаюцца працы на беларускай мове (вітаюцца арыгінальнасць і творчы падыход да афармлення).

Намінацыі конкурсу маюць тры ўзроставыя катэгорыі: ад 3 да 6 гадоў (дзеці ўдзельнічаюць у конкурсе на лепшы малюнак), ад 7 да 12 гадоў, ад 13 да 18 гадоў. Па кожнай намінацыі вызначаюцца пераможцы па ўзроставых катэгорыях з прысуджэннем дыпломаў першай, другой і трэцяй ступені.

Конкурс праводзіцца па наступных намінацыях:

— лепшы малюнак пра Беларусь (фармат А4 і А3);

— фотаздымак аб Беларусі (памер здымка ад 18х24 см і вышэй);

— літаратурна-паэтычны твор (апавяданні, вершы, замалёўкі і г.д.);

— сачыненне „Беларусь у гісторыі маёй сям'і";

— лепшая публікацыя аб Беларусі ў сродках масавай інфармацыі;

— распрацоўка сімвала конкурсу „Пазнай Беларусь".

Кожны ўдзельнік конкурсу адзначаецца ганаровым дыпломам, а пераможцы конкурсу ўзнагароджваюцца каштоўнымі прызамі. Падвядзенне вынікаў конкурсу адбудзецца ў будынку Культурнага цэнтра Беларусі з запрашэннем СМІ, прадстаўнікоў Пасольства, беларускай грамадскасці. Для ўдзельнікаў і пераможцаў конкурсу рыхтуецца канцэртная праграма з запрашэннем дзіцячага мастацкага калектыву з Беларусі і з удзелам творчых дзіцячых калектываў беларускай меншасці ў Польшчы. У выставачных залах КЦБ будзе разгорнута выставачная экспазіцыя з лепшых работ удзельнікаў конкурсу.

Прыняцце да разгляду матэрыялаў — **да 15 красавіка 2009 г.** Да 30 красавіка 2009 г. — падвядзенне вынікаў конкурсу. Аб выніках конкурсу і месцы ўрачыстага падвядзення вынікаў настаўнікі і вучні будуць папярэджаны загадзя.

Конкурсныя работы можна дасылаць на адрас: Культурны цэнтр Беларусі ў Польшчы, вул. Модліньска, 2, 15-066 Беласток, тэл./факс 085 732 03 56.

Конкурс плануецца зрабіць традыцыйным і праводзіць штогод. З гэтай нагоды сёлета ўводзіцца дадатковая намінацыя — „Сімвал конкурсу «Пазнай Беларусь»" (адно першае месца).

Іншы свет і свая сволач!

— Такія з'явы як „рэгіянальная свядомасць" не сустракаюцца ў прыродзе беларускіх памежжаў, — кажа доктар Эдуард Мазько з Гродзенскага ўніверсітэта.

Свет жыхароў беларускіх памежжаў звычайна падзяляецца на тры часткі: *наш свет* (нашы людзі, свая вёска, парафія, калгас), *іншы свет* (другая вёска, якая можа ў нічым не адрозніваецца ад нашай, іншы калгас, іншая парафія), *чужы свет* (ён па-за межамі іншага свету). Як прыклад чужога жыхары беларускіх памежжаў найчасцей называлі немцаў, з якімі быў абмежаваны кантакт. Іх баяліся, *пры іх стаялі як памерлыя.* Прытым памагатых немцаў, паліцаяў і сышчыкаў, называлі: *свой хлопец* або *свая сволач*. Сваімі лічылі таксама яўрэяў і цыганоў, якія явіліся як неад'емная частка іх свету...

Даклад Эдуарда Мазько „Чалавек памежжа Беларусі ў XX стагоддзі", — чарговая прапанова Кафедры беларускай культуры ў Беластоку 26 лютага г.г. у рамках г.зв. „беларускіх чацвяргоў". Прадстаўлены аўдыторыі прыклады, жывы даследчыцкі матэрыял сабраны на працягу 2001-2006 гадоў на Беласточчыне, Гродзеншчыне, Магілёўшчыне, Гомельшчыне. Доктар Мазько — удзельнік Міжнароднай гуманістычнай школы пад кірункам прафесар Альжбеты Смулковай. У выніку экспедыцыяў было праведзена за трыста інтэрв'ю з людзьмі народжанымі ў 1920-30 гады. Структуралізацыя часу бачыцца як змены ўлады — інфарматары не перамяшчаючыся з месца мянялі некалькі разоў грамадзянства. У іх свядомасці час падзяляўся на даваенны перыяд, час вайны, пасляваенны перыяд аж да 1990-ых. Як паказалі доследы, самым трагічным і цяжкім для ўсіх жыхароў пералічаных памежжаў паказаўся час вайны. Прытым ярка адзначаны падзел на „ўсход і заходнікаў". Заходнікі — паводле ўсходнікаў: *другі свет, дзе не было голаду і немцы іх больш любілі (менш білі)...*

Жывы даклад Эдуарда Мазько выклікаў шмат пытанняў і асаблівых рэфлексіяў пра менталітэт людзей памежжаў.

(гак)

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

„Бацькаўшчына" рыхтуецца да V З'езда беларусаў свету

18-19 ліпеня 2009 г. адбудзецца V З'езд беларусаў свету. Падрыхтоўцы да гэтага значнага форуму было прысвечана пасяджэнне Малой Рады МГА „ЗБС „Бацькаўшчына" 2 сакавіка.

На пасяджэнні была агучана тэма з'езда — „Нацыянальная ідэнтычнасць беларусаў у сучасным свеце: праблемы захавання і развіцця", і назвы трох секцый, якія будуць працаваць цягам двух дзён: „Сродкі нацыянальнай ідэнтыфікацыі беларусаў у Беларусі і свеце (мова, літаратура, мастацтва, друк і г.д.)"; „Магчымасці ўзаемадзеяння метраполіі і дыяспары ў захаванні нацыянальнай ідэнтычнасці і культурнай спадчыны беларусаў"; „Супольная гістарычная памяць як аснова нацыянальнай еднасці беларусаў у свеце".

Дзеля належнай падрыхтоўкі і правядзення З'езда быў створаны Арганізацыйны камітэт, у склад якога ўвайшлі 88 прадстаўнікоў з Беларусі і розных краін свету. Сустаршынямі Аргкамітэта абраныя Радзім Гарэцкі, Аляксей Марачкін, Алена Макоўская з беларускага боку, Алег Рудакоў з Расіі і Вячка Станкевіч з ЗША. Сябры Рады зацвердзілі план працы Аргкамітэта і Рабочай групы. У склад Рабочай групы, якая будзе здзяйсняць непасрэдную падрыхтоўку да З'езда, было абрана 16 асоб на чале з Нінай Шыдлоўскай, намесніцай старшыні Рады.

Важным юрыдычным вынікам пасяджэння з'яўляецца зацвярджэнне нормаў прадстаўніцтва дэлегатаў на З'езд. З гэтага моманту будзе пачата вылучэнне дэлегатаў ад 29 краін свету і Беларусі.

Сябры Малой Рады зацвердзілі бюджэт З'езда і заслухалі інфармацыю аб пошуках памяшкання для правядзення сусветнага форуму. Было адзначана, што ўжо зараз становіцца відавочным, што знайсці памяшканне ў Мінску будзе нялёгка, як было і перад мінулым з'ездам. Таму сябры Малой Рады пацвердзілі гатоўнасць, у выпадку перашкодаў з атрыманнем памяшкання ў сталіцы метраполіі, рыхтавацца да правядзення З'езду беларусаў свету ў суседніх краінах.

Інфармацыйны цэнтр МГА „ЗБС «Бацькаўшчына»"

Мястэчка Беразіно, што стаіць над ракой Бярэзінай, найбольш вядомае падзеямі, што адбыліся тут напачатку XIX стагоддзя. Калі Напалеону ў 1812 г. не ўдалося перамагчы рускую армію, яму нічога не заставалася як адступаць. Рускія гналі разбітае французскае войска акурат тым шляхам, якім вялікі заваёўнік вёў яго на Маскву. І шлях гэты пралягаў праз раку Бярэзіну, дзе і загінула вялікае мноства французаў.

Усё гэта было даўно. Але і цяпер бярэзінцам ёсць што распавесці свету аб сабе. І найбольш апантаныя патрыёты горада робяць гэта праз інтэрнэт. Для больш шчыльнага знаёмства з Беразіно варта наведаць сайт, які называецца яго неафіцыйнай старонкай і месціцца па адрасе http://www.berezino.net.

Да гонару распрацоўшчыкаў і натхняльнікаў гэтага інтэрнэт-партала трэба адзначыць, што папрацавалі яны над ім вельмі добра. Сайт аздоблены выдатнымі фотаздымкамі з краявідамі Беразіны. Да таго ж на сайце маецца вялікая колькасць рубрык. Усе яны разам узятыя выдатна ствараюць у віртуальнага наведвальніка Беразіно даволі поўнае ўяўленне аб горадзе.

Як і мае быць пачынаюцца рубрыкі з „Гісторыі". Нейкіх гістарычных расповедаў пра гісторыю Беразіно і ягонага наваколля тут няма, але сайт прапануе пазнаёміцца з надзвычай падрабязнай храналогіяй падзей, звязаных з тымі мясцінамі. Цікава, што старонка аздоблена фотаздымкамі існуючых дагэтуль архітэктурных збудаванняў, якія за часы савецкай улады з большага прыйшлі ў заняпад і стаяць зусім недагледжаныя.

Даведацца пра рэлігійную палітру Бярэзіншчыны можна на старонцы „Рэлігіі раёну". Гэтая старонка таксама аздоблена фотаздымкамі храмаў разнастайных канфесій і мае выйсці да расповедаў аб праваслаўі, каталіцызме, юдаізме ў Беразіно і наваколлі, а таксама пра татараў, якія калісьці там жылі.

Энцыклапедыяй выдатных асоб Бярэзіншчыны можна назваць старонку „Выбітныя бярэзінцы". Тут месціцца не толькі агромністы пералік тых, якімі ганарацца жыхары горада, але і біяграфічныя расповеды пра многіх з іх. Праўда, даволі вялікая колькасць пералічаных імён і прозвішчаў пакуль без гіперспасылак на расповеды аб выдатных бярэзінцах. Гэта значыць, што натхняльнікам сайта ёсць яшчэ над чым працаваць, насычаючы інфармацыяй гэтую цікавую рубрыку.

Убачыць Беразіно на свае вочы, не адыходзячы ад камп'ютара, дазваляе старонка „Здымкі". Колькасць здымкаў сапраўды ўражвае, прычым кожнае выяўленне падпісанае, што дае магчымасць карыстальніку віртуальна знаёміцца з горадам.

Рубрыка „Вёскі раёну" месціць не толькі агромністы спіс вёсак Бярэзіншчыны, але і расповеды аб іх. Праўда, гэтая рубрыка таксама патрабуе працы распрацоўшчыкаў, бо далёка не ўсе з пералічаных паселішчаў маюць якую-небудзь інфармацыю пра сябе на сайце.

Не абышлі ўвагай стваральнікі „Неафіцыйнай старонкі Беразіно" і аднаго з найтрагічнейшых перыядаў гісторыі — сталінскіх рэпрэсій. На старонцы „Рэпрэсаваныя" месціцца перадрукоўка з сайта „Мартыралог.org", дзе ходзіць пра загінуўшых падчас сталінскага ліхалецця жыхароў Бярэзіншчыны.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь, беларусы...

Трымацца свайго

Шмат дзідаў было зламана апошнім часам у дыскусіях наконт удзелу беларускіх хакейных клубаў у расійскім праекце пад назвай Кантынентальная хакейная ліга. Дэбют мінскага „Дынама" ў ёй не прынёс ні маральных (месца ў хвасце турнірнай табліцы) ні пакуль матэрыяльных дывідэндаў айчыннай гульні нумар адзін. А вось нацыянальны адкрыты чэмпіянат краіны па-сапраўднаму радуе заўзятараў. Так што яго можна лічыць абсалютна самадастатковым. Старт стадыі плэй-оф яшчэ болей распаліў да яго інтарэс. Сталіцу то нічым не здзівіш, а вось лядовыя арэны ў Гомелі, Жлобіне, Магілёве, Гродне ды Віцебску збіраюць зараз сапраўдныя аншлагі.

Прадказаць зыход чвэрцьфінальных серыяў мала хто браўся. Бадай, толькі лідэр рэгулярнага першынства мінскае „Юнацтва" выглядае відавочным фаварытам свайго спабору. На момант напісання гэтых радкоў лік у серыі быў 2:0 на карысць падначаленых Міхаіла Захарава, але і ім дзве вікторыі на сваім лёдзе над восьмай камандай „рэгуляркі" наваполацкім „Хімікам-СКА" даліся вох як няпроста. У першым матчы 4:1, у другім толькі 5:4 у авертайме. А вось у астатніх парах, прайграўшыя ў першых паядынках, узялі рэванш і такім чынам усталявалі ў серыях парытэт — 1:1. Гарадзенскі „Нёман", які з прыходам на трэнерскі мосцік амбітнага Дзмітрыя Краўчанкі перажывае сапраўдны рэнесанс, дасягнуў сатысфакцыі ў Гомелі — 2:1. Радаваўся ў Магілёве пасля фінальнай сірэны і „Віцебск", які па ходзе саступаў мясцоваму „Хімвалакну" — 0:2, але ўрэшце вырваў вікторыю — 4:3. А жлобінскі „Металург", пасля паразы ў стартавым паядынку, у гульні з дзейсным чэмпіёнам сталічным „Керамінам" рэабілітаваўся перад сваімі прыхільнікамі — 6:4. Героем сустрэчы стаў форвард жлобінцаў Генадзь Савілаў, які аформіў хет-трык. На гэтым тыдні каманды памяняліся пляцоўкамі і працягвалі баталіі. Нагадаю, што на стадыі чвэрцьфіналу змаганне ў серыях ідзе да трох перамог аднаго з клубаў.

Можна толькі ўявіць гіпатэтычна, што ўдзел таго ж „Дынама" (ненатуральным чынам пераўтворанага ў флагман) у сваім родным першынстве толькі дадаў бы перцу ў інтрыгу нацыянальнага турніру. А так, гульцы „Дынама", якое не прабілася ў плэй-оф КХЛ, зараз больш месяца будуць боўтацца без сапраўднай справы. Гэта значыць перадусім, што кандыдаты ў нацыянальную зборную Беларусі не атрымаюць так патрэбнай практыкі перад чэмпіянатам свету. Так што лепш не ганяцца за прывідным жураўлём на бяскрайніх расійскіх прасторах, а шанаваць сваё, трымаючы адчыненымі дзверы для суседзяў. Так, як гэта было ў бягучым сезоне з удзелам у рэгулярным чэмпіянаце нашай экстралігі латышоў. У свой час развіццё айчыннага хакея пайшло ў час існавання Усходне-Еўрапейскай хакейнай лігі, дзе асновай цэлы час былі беларускія клубы, а суседнія латвійскія, украінскія, літоўскія каманды былі дадаткам. Бясспрэчна, што той балтыйска-чарнаморскі хакейны звяз быў выгадным для ўсіх.

У дадатак да тэмы зборнай можна заўважыць, што на першынстве планеты яна напэўна зможа разлічваць на ўзмацненне заакіянскімі легіянерамі — „Таронта" нашага форварда Міхаіла Грабоўскага і „Каларада" беларускага абаронца Руслана Салея відавочна не трапляюць у розыгрыш Кубку Стэнлі. Цяпер справа за федэрацыяй і менеджэрамі зборнай, якія мусяць папрацаваць, каб у час сабраць усіх мацнейшых.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Эх, чыгунка, чыгунка...

У пятніцу, 27 лютага, у 16 гадзін вяртаўся я з Беластока ў Чаромху на рэйкавым аўтобусе. Гэта маё першае падарожжа паводле раскладу язды, які абавязвае ад 14 снежня 2008 г. Аднак гэтага было дастаткова, каб паназіраць як Беластоцкае прадпрыемства пасажырскай перавозкі ставіцца да кліентаў. Цягнік па маршруце адпраўляецца ў 16 гадзін, але на пасадку пасажырам прызначаецца адно некалькі хвілін. Справа ў тым, што поезд прыбывае з Чаромхі ў 15:53 і на працягу сямі мінут павінен зрабіць манеўры (перастаўляецца з адной пуці на другую) і толькі тады пасажыры могуць займаць месцы. Так быць павінна, але праўда іншая. Калі я апынуўся пры пятым пероне на 15 мінут да ад'езду цягніка, чакала там ужо больш дзесяці пасажыраў (школьнай моладзі), ды штораз падыходзілі іншыя. Рэйкавы аўтобус з Чаромхі прыехаў без дзесяці мінут чацвёртая (тры мінуты перад часам). Дыктар па мегафоне аб'явіў, што цягнік закончыў маршрут і пасажыры не павінны ў яго заходзіць. Гэтыя словы былі спозненымі. Падросткі, не дазволіўшы выйсці прыезджым, гурбай хлынулі ў аўтобус. Два маленькія вагончыкі былі поўнасцю набіты. З пасажырамі рабіліся манеўры. З другога боку пятага перона чакала на пасадку больш дзесяці пасажыраў. Для гэтых не было ўжо сядзячага месца. Дзякуючы спраўнасці машыніста, які круціўся быццам уюн пры манеўрах, цягнік адправіўся ў назначаны час. На прыпынку Беласток-Стадыён пасажыры, якія зрабілі пасадку, вымушаны былі падарожнічаць стоячы. Але не адна гэта загана. У старэнькім рэйкавым аўтобусе няма туалета. Пасажыры вымушаны стрымлівацца з фізіялагічнымі патрэбамі, бо інакш — хоць ты гвалту крычы. Дзеля эканомікі чыгунка пазакрывала туалеты на прыпынках. Чалавеку ў выпадку патрэбы трэба ў кусцікі бегчы, або на пероне, адвярнуўшыся, спраўляць патрэбу. Вось да чаго дакацілася чыгунка ў дваццаць першым стагоддзі. Кашмар! Праблема ўсім добра вядомая і на гэта няма паратунку. Мая тут „маленькая" заўвага ў адрас перавозчыка: ці нельга было б адпраўляць цягнік з Беластока прынамсі на 10-15 мінут пазней? Гэты маршрут не звязаны ў Чаромсе са спалучэннем у напрамку Седльцаў ці ў Высока-Літоўска, бо ў першым выпадку цягнік у Седльцы адпраўляецца у 18:49, а ў Высока-Літоўск у 17:21 (цягнік з Беластока прыязджае ў 17:47). І другая справа. Вышэйпаказаны прыклад падказвае, што ў пятніцу на 16-ю гадзіну павінны падстаўляць прынамсі рэйкавы аўтобус новага тыпу, у якім знаходзіцца туалет і больш сядзячых месц. Гэта пакрысе вырашыла б праблему падарожжа на лініі Беласток — Чаромха перад уік-эндам.

Уладзімір СІДАРУК

Нам песня жыць памагае

Паспяхова прайшлі мерапрыемствы XVI Агульнапольскага фестывалю „Беларуская песня — 2009" і XXV Ваяводскай сустрэчы калядных калектываў „Гайнаўка-2009". Беларускія вясковыя калектывы, хаця выступаюць у іх людзі пажылога ўзросту, спяваюць ад душы, славячы родную старонку.

Згаданыя і падобныя ім мерапрыемствы — сведчанне нашага патрыятызму, праявай якога стала песня — самы даступны від мастацтва, які найбольш уздзейнічае на людзей. Песня спадарожнічае чалавеку з моманту нараджэння да апошніх яго дзён. З песняй людзі ішлі на самыя суровыя выпрабаванні.

У наш час родную песню папулярызуюць дамы культуры, БГКТ, духавенства, СМІ, асабліва беларускія перадачы. Як прыемна глядзець на нашы беларускія калектывы, апранутыя ў нацыянальныя касцюмы, падараваныя нашай духовай айчынай Беларуссю. Самае прыемнае, што многія песні, якія спяваюць калектывы, вядомыя публіцы на Беласточчыне — тым кутку Польшчы, дзе пражывае найбольш беларусаў.

Беларусы Польшчы падтрымліваюць культурныя сувязі з Беларуссю. Гэта дапамагае актывізацыі нацыянальнай самасвядомасці. Беларусы Польшчы разумеюць сваю прыналежнасць да польскай дзяржавы, яны яе грамадзяне, але таксама праяўляюць сыноўскія пачуцці да этнічнай радзімы Беларусі. На маю думку, у нашым жыцці адбываецца шмат новага. У мазаіцы культурнай дзейнасці праглядаецца і тэндэнцыя да інтэграцыі, аб'яднання вакол сваіх беларускіх арганізацый, чаму дапамагае, між іншым, і родная песня.

Віктар БУРА

Расхутаць не ўдалося

Было гэта так. Да свайго невялічкага зборніка вершаў з мінулага трэба было дапісаць яшчэ адзін. Проста ў выніку хатняй вёрсткі зборніка атрымалася адна пустая старонка, якая зусім не падыходзіла да агульнай мастацкай канцэпцыі. Што ж рабіць? Зусім я разгубіўся. Жонка прыўважыла, што я чымсьці турбуюся. А зборнік рыхтую ўжо добрых некалькі гадоў. Час бяжыць маланкава. Сямейная атмасфера вельмі напружаная, а тут трэба вырашаць штодзённыя праблемы, тым болей што з тэлебачання шчэрыць зубы глабальны крызіс.

— Дапішы яшчэ адзін, — падказвае жонка.

Праўда, вершы з так званага стала, якія дзякуючы зборніку паявяцца ў публічнай прасторы, саракагадовай даўнасці! У першую хвіліну мільганула думка: „Чаму не, можа ўдасца". Не ўдалося. Хаця інспіравалі тры радкі, некалі запісаныя мною на кафейнай сурвэтцы:

Што мне там віхры гісторыі
Я маю свой свет захутаны ў інтымнасць

.....

А што далей? Спаць не мог. Як калісь, усё прыдумваў розныя фразы для наступных радкоў верша. Фактычна, захутаў я свой свет. Але ў інтымнасць? Ці магу так сваё чэрава выносіць на публічнае абмеркаванне? Вядома, далей трэба было б тую інтымнасць расхутаць, і то яшчэ метафарычна, бо верш без метафары гэта не паэзія. Да таго верш мае быць лірычны і зразумелы кожнаму чытачу. Каб потым ён не пытаў у аўтара, што той меў на думцы, калі ўжо захутаў свет у інтымнасць.

Пачаў я нават зайздросціць паэтам, якія публікуюць сваю творчасць у „Ніве".

Можа няма ўжо ў мяне такога творчага натхнення як калісь, калі з дрыготкім сэрцам ішоў я на спатканне сваёй будучыні, а па дарозе, шчаслівы, натхнёна складаў радкі слоў.

Міхась КУПТЭЛЬ

Сучаснасць у вёсцы

Жыццё ідзе наперад. Сучаснасць дакацілася да невялікіх прыпушчанскіх вёсак.

Нягледзячы на зімовыя халады, бельскае прадпрыемства „Бельбуд" робіць каналізацыю ў Альхоўцы Нараўчанскай гміны. Магутныя экскаватары рыюць на краю вуліцы 3-4-метровую канаву і кладуць каналізацыйныя трубы.

За каналізацыю на вуліцы гміна заплаціла прадпрыемству 1 млн. 300 тыс. злотых. За працу на панадворках будуць плаціць жыхары Альхоўкі ў сярэднім 100 злотых за метр. Людзі гавораць, што інвестыцыя дарагая, але вельмі патрэбная. Сучасны чалавек павінен жыць па-сучаснаму.

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

Ніўская дапамога

У 7 нумары „Нівы" ад 15.02.2009 г. мы ў допісе „Таполі" крытыкавалі, што не забіраюць ссечаных таполяў у Плянце (Нараўчанская гміна). 2 снежня 2008 г. купіла іх была ды ссекла суполка з Міхалова. Бярвенні праляжалі ля тамашняга скрыжавання дарог ажно амаль тры месяцы.

У канцы лютага г.г. (27.02. іх ужо не было) іх забралі. Ніўская крытыка была паспяховай-удачнай.

(яц)

Адгаданка

1			2					3					
					4							5	
					6		7		8		9		
				10		11			12				

1. скарасны спуск на лыжах з гары па зададзеным складаным маршруце, 2. Гарыслава, полацкая княгіня, 3. цёплая краіна, у якой зімуюць пералётныя птушкі, 4. пасудзіна для зачэрпвання вады з калодзежа, 5. не гарызанталь, 6. уласная назва Фінляндыі, 7. вінакурны завод, 8. старажытнамесапатамскі горад, 9. слова блізкае па значэнню другому слову, 10. работнік чыгуначнага транспарту, які суправаджае цягнікі, 11. хвойнае дрэва сямейства кіпарысавых (Thuja), 12. няяўка на работу без уважлівых прычын.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — партугальская пагаворка.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 6 нумара

Дзевяць, зяць, Італія, млын, навука, хмыз, човен.

Рашэнне: **Дзе вялікія званы звоняць, там малых не чуць.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.
Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,65 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 500 egz.

Тэкст і фота
Мацея ХАЛАДОЎСКАГА



Крыж з Градалёў

— У гэтых мурах, дзе сёння вучацца дзеці і чутны гукі класічнай музыкі, калісь былі чутны гукі злавесныя, — сказаў у каталіцкі Папелец гісторык з Беластоцкага аддзела Інстытута нацыянальнай памяці (ІНП)) Тамаш Данілецкі ў час прамоцыі ў цяперашняй музычнай школе ў Бельску-Падляшскім кніжкі аб Установе бяспекі ў гэтым горадзе ў 1944-1956 гадах. Тым часам у акалічных Градалях старэйшыя жыхары памятаюць аб рэпрэсіях УБ у тадышні час, якія сустрэлі некалькіх з іхніх землякоў пасля таго, як пры цудадзейнай крынічцы былі ўзведзены крыжы, а пасля каплічка.

Градалі распаложаны каля 12 кіламетраў ад Бельска. Градалёўцы гавораць па-свойму. З гэтай вёскі родам дырэктар Бельскага дома культуры Сяргей Лукашук, якому ўжо за шэсцьдзесят:

— Я ў той час быў малым дзіцём. А памятаю толькі, што ў ляску на адной з дарог у вёску, пры крынічцы нейкі прыезджы сляпец прамыў вочы і стаў бачыць. Кажуць, гэта ён ад удзячнасці паставіў там крыж.

У вёсцы кажуць

Градалёўская цудадзейная крынічка па дарозе ў Рыгораўцы сёння абудаваная бетоннымі кругамі; гэта студня ў малой драўлянай каплічцы, аколеная іконамі. Побач стаіць значна большая капліца-царкоўка, пабудаваная ўжо ў 1993 г. Збоч ад іх некалькі крыжоў. Штогод 6 мая на Юр'я адбываецца тут царкоўны фэст. У вёсцы тым, што з таго часу памятаюць штонебудзь, ужо за восемдзесят.

Спадар Уладзімір Астапчук:

— Арыштавалі Дзяніса, Ляша, Астапчука, Лукашука Сцяпана. Можа быў і Коля Мартынюк, і Андраюк Сцяпан. Завалаклі агулам ва УБ у Бельск сямёх ці васьмёх. Дакладна ўжо не памятаю. Мне тады было семнаццаць. Не памятаю, хто першы прывёз гэты крыж. Аднойчы паявіўся пры крынічцы з надпісам пра вёску, з якой прыехаў. Пасля на другі крыж сасновую драўніну Вольга Рыжык падаравала. УБ чаплялася, што вакол крыжа ля крынічкі мы паставілі агароджу, і што распавядаюць пра тое, што Госпад камусьці там памог. Хто данёс ва УБ, не ведаю. З нашай вёскі ўбоўцаў у Бельску не было. Ведаю, што былі з Краснага Сяла і з Москаўцаў. Ды не яны сюды арыштаваць прыехалі. Прыехалі чужыя.

Вольга Рыжык:

— Як іх арыштавалі, не памятаю, бо больш часу я тады была ў Мокрым. Але крыж паставілі раней. Я толькі чула, што кагось арыштавалі, і што крыху патрымалі іх у турме. А тая вада з крынічкі напэўна памагала! У мяне бародаўкі прапалі, калі іх тою вадой прамыла. Ксеня больш памятае. Яна ўсё памятае.

Ксеня Барташук прыгадвае:

— Арыштавалі трох: Дзяніса Шымчука, Сцяпана Лукашука і Мікалая Мартынюка. Калі сталі тыя крыжы, які гэта быў год?.. Не памятаю. Дзесьці зараз пасля вайны. Можа быў гэта 1947 год, бо я тады была яшчэ ў дзеўках. Сляпы Федзя з Лядаў казаў, што крынічка цудадзейная, бо яму памагла. Раней з Баравікоў, каля Нурца, хтосьці паставіў крыж. Напісаў, што быў сляпы, прамыў вочы гэтай вадой, зрок яму вярнуўся і крыж за гэта паставіў. Ніхто нічога не бачыў. Пасля і мы зрабілі крыж і разам, хлопцы і дзяўчаты, туды яго занеслі. Пакойны ўжо бацюшка з Падбелля яго пасвянціў. Ад таго часу людзі пачалі таму крыжу пакланяцца. З часам крынічку забудавалі і зрабілі тут калодзеж. Крынічка сапраўды памагала, але калі нейкая жанчына прамыла вочы свайму сабаку, вада страціла сваю моц. А ва УБ данёс Качурак з-за чыгуначнай станцыі. Даўно ўжо памёр. Быў каталікам і нашто былі яму такія праваслаўныя цуды.

Уладзімір Астапчук

Эмоцыі ўсё моцныя

Тамаш Данілецкі і другі з беластоцкіх гісторыкаў ІНП Марцін Звольскі (пакаленне саракагодкаў) у сваёй кніжцы „UBP w Bielsku Podlaskim (1944-1956)" пішуць, што да арыштавання трох асоб дайшло ў 1951 годзе, пасля таго, як пры цудадзейнай крынічцы была ўзведзена каплічка і пасвянціў яе мясцовы бацюшка. Тут спасылаюцца на сціплыя дакументы, сабраныя іншым беластоцкім гісторыкам Кшыштафам Сыховічам у публікацыі „Władza ludowa a Kościół prawosławny w województwie białostockim w latach 1944-1956". У час сустрэчы ў былой сядзібе бельскай УБ гаворкі, аднак, аб гісторыі цудадзейнай крынічкі, крыжа і каплічкі ды арыштаў жыхароў Градалёў не было. У зале сённяшняй музычнай школы, у былым кляштарным комплексе, на якім вісяць тры мемарыяльныя дошкі, устаноўленыя перш за ўсё Сусветным саюзам Арміі краёвай, Марцін Звольскі гаварыў аб кніжцы:

Ксеня Барташук

— Гэта не ёсць кніга аб незалежніцкім падполлі на гэтай тэрыторыі. Пішам аб незалежніцкім падполлі ў кантэксце дзеянняў УБ. Тут працавалі асабліва жорсткія функцыянеры.

На сустрэчу, што прамавала гэтую кнігу, прыйшло адносна шмат людзей — каля шасцідзесяці. З'явіўся шэф бельскай Службы бяспекі з васьмідзесятых гадоў Анатоль Навіцкі.

Вольга Рыжык

— Як гэта ён меў такую нахабнасць тут з'явіцца, — не хаваў нерваў адзін з удзельнікаў сустрэчы.

Хтосьці іншы пакрыкваў:

— Сядзіш пан сагнуты, баішся? Устань, пан, і пакажыся!

Анатоль Навіцкі седзячы кінуў толькі:

— Я не баюся. Магу ўстаць, але не ўпаду на калені.

Пан Ігнацы Гжыбоўскі дзяліўся ў сваю чаргу ўспамінамі:

— У 1958 г. у кваліфікацыйнай размове ў школу ў Элку былы бельскі ўбэк, а тады русіст у гэтай школе, пачуўшы, што мая сям'я родам з Бадак заявіў: „То ж ты з бандыцкай вёскі!"

УБ супольна з НКВД яшчэ ў 1945 г. за калабарацыю з палітычна варожай партызанкай спаліла гэтую вёску, а каля паўсотні людзей забіла.

Градалёўцы, з якімі мы размаўлялі перад спатканнем у музычнай школе, не даехалі. Не хапіла ім сілы.

15.03 — 21.03

(22.03. — 20.04.) Аслабне твой запал. Агорнуць цябе сумненні і з цяжкасцю будзеш брацца за талковыя вырашэнні. Рабі тое, што адчуваеш, а не тое, што мусіш рабіць. 16-20.03. адчуеш стому ад працы і нервовасць. Не бяры нічога важнага сабе на галаву.

(21.04. — 21.05.) Зробіш першы крок, што пацягне за сабою лавіну падзей. Не палі за сабой мастоў. Усе раманы і патаемныя флірты хутка выйдуць на вока. Не рабі нічога на сілу, упіранне на сваім не прынясе карысці.

(22.05. — 22.06.) 17-21.03. праблемы ў паразуменні з іншымі. Людзі блага адчытаюць твае намеры. Не ацаняй неабдумана іншых, бо хутка акажацца, што ты памыліўся. Затое ў прафесійных справах чакаюць цябе поспехі, на якія ты не разлічваў.

(23.06. — 23.07.) Да 16.03. добры час на навуку і кантакты. 16-20.03. нервовасць, сямейныя клопаты, праблемы ў кампанейскіх кантактах. Калі моцна будзеш трымацца старога, страціш шанц развіцця. Усё, што робіш, будзе залежаць ад твае самаацэнкі.

(24.07. — 23.08.) Выплывеш на шырокія воды і нішто не стрымае цябе ад таго, каб рабіць тое, на што маеш ахвоту. Выкарыстай свае пяць хвілін, калі нават заплаціш за гэта нямала. Мяжа паміж каханнем і нянавісцю акажацца быць вельмі тонкай.

(24.08. — 23.09.) З 20.03. (да 24.03.) адкрыюцца перад табой новыя магчымасці. Гэта знакаміты час на сустрэчы і накіроўванне сваіх крокаў за сваімі помысламі. Людзі цябе нічым не задзівяць. Ад блізкіх атрымаеш моцную падтрымку.

(24.09. — 23.10.) Дай партнёру свабодную руку і не прабуй яго пераконваць сілай. Раздумы аб мінулым могуць давесці да таго, што няхочучы раскрыеш скрынку Пандоры. Мары можаш зрэалізаваць, звярнуўшыся да адпаведных асоб.

(24.10. — 22.11.) 17-21.03. спадарожнічаць табе будзе сіла волі, энергія, эфектыўнасць і адчай. Пераканаеш іншых да сябе і выйграеш кожную бітву. 21.03. можаш падпасці камусьці, каго лепш не чапаць. У каханні раптоўныя змены акцыі і парываў сэрца.

(23.11. — 22.12.) Карысны ўплыў зорак на твае творчыя сілы. Аднак пры нагодзе дасі падвесці сябе вешчунам прыгожых лозунгаў, адначасова рабіўшым брудныя інтарэсы. Адносіны з каханай асобай нагадваюць гульню кошкі з мышкай. На працы — ідылія і прыліў грошай.

(23.12. — 20.01.) Да 16.03. гарманічнае супрацоўніцтва, умеласць негацыяцый, здольнасць пераконвання. 17-21.03. праблемы ў прафесійным і асабістым жыцці. Не забывайся аб важных дамовах, не прапускай тэрмінаў. Цяжкавата дагаварыцца з людзьмі і запанаваць над колькасцю спраў.

(21.01. — 19.02.) 15.03. можаш сустрэць цікавую асобу. З 20.03. (да 24.03.) будзеш напоўнены аптымізмам, верай у сябе, добрым настроем. Час на важныя размовы, абмеркаванні прафесійных спраў, працоўную дзейнасць. Адкрыешся на новае, небанальнае, арыгінальнае.

(20.02. — 21.03.) Шмат спраў высветліцца ў тваю карысць. Будзеш мець мноства запалу і энергіі. Карысныя сяброўствы з асобамі маладзейшымі за цябе. Некаторыя справы схочацца паставіць рубам. Не раскідайся грашыма перш за ўсё пры поўні Месяца.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960